*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ВЕРАСНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 167 (26280)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

*Ідзе падпіска на IV квартал 2008 года*

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 9200 | 27600 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8700 | 26100 |
| 63858 (ведамасны) | 14700 | 44100 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 13400 | 40200 |

## Тэндэнцыя да зніжэння колькасці злачынстваў намецілася ў Беларусі

**У Беларусі за 8 месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года агульная колькасць злачынстваў знізілася на 12 працэнтаў, у тым ліку колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх — амаль на 10 працэнтаў. Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку 4 верасня далажыў генеральны пракурор Рыгор ВАСІЛЕВІЧ.**

На 18 працэнтаў зменшылася колькасць забойстваў, на 30 працэнтаў — разбояў, на 22 працэнты — грабяжоў.

Значную долю (54 працэнты) у агульнай колькасці злачынстваў (105000), учыненых за 8 месяцаў гэтага года, склалі крадзяжы, хоць іх колькасць знізілася на 16 працэнтаў. У стане ап'янення ўчынена 36 працэнтаў злачынстваў. Як адзначыў Рыгор Васілевіч, да недахопаў работы праваахоўных органаў, мясцовай улады ў частцы папярэджання злачынстваў можна аднесці тое, што рэцыдыў злачынстваў складае 54 працэнты.

Прэзідэнт запатрабаваў палепшыць якасць і павысіць аператыўнасць следства. Гэтыя задачы датычацца ўсіх праваахоўных органаў. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў ідэю больш дасканалай індывідуалізацыі крымінальнага пакарання, каб меры крымінальнай адказнасці былі адэкватныя цяжкасці ўчыненага злачынства. Аляксандр Лукашэнка таксама падтрымаў прапанову аб выключэнні з Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Беларусі нормы аб абавязковым удзеле дзяржабвінаваўцы па справах паскоранага вядзення. Як правіла, гэта 25—30 працэнтаў крымінальных спраў, якія не маюць вялікай грамадскай небяспекі і дзе віна прызнаецца абвінавачаным. Прэзідэнт запатрабаваў, каб мясцовыя органы выканаўчай улады таксама займаліся прафілактыкай правапарушэнняў, у тым ліку злачынстваў.

## Беларускі рубель з пачатку года ўмацаваўся адносна ўсіх асноўных валют

**Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку далажыў 4 верасня старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.**

Як адзначыў Пётр Пракаповіч, такое ўмацаванне беларускага рубля адбылося ўпершыню за ўвесь час існавання нацыянальнай валюты. Прэзідэнт праінфармаваны аб рабоце банкаўскай сістэмы за восем месяцаў гэтага года. Усе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі ў 2008 годзе выконваюцца ў поўным аб'ёме. У краіне апераджальнымі тэмпамі ідзе крэдытаванне эканомікі. У параўнанні з мінулым годам аб'ёмы банкаўскіх крэдытаў для рэальнага сектара эканомікі павялічыліся ў 1,6 раза. У выніку правядзення працэнтнай палітыкі, стымулюючай уклады насельніцтва, з пачатку года перавыконваецца праграма па нарошчванні ўкладаў насельніцтва. Стабільна працуе плацежная сістэма.

Кіраўніку дзяржавы таксама далажана аб выкананні праграмы развіцця банкаўскага сектара на 2006-2010 гады. Старшыня праўлення Нацбанка падкрэсліў, што па адным з галоўных паказчыкаў — нарошчванні рэсурснай базы банкаўскай сістэмы — пяцігадовая праграма практычна ўжо выканана. Чакаецца, што да канца 2010 года яе аб'ём не менш як у два разы перавысіць запланаваны.

На сустрэчы ішла размова аб выкананні і іншых даручэнняў кіраўніка дзяржавы, у прыватнасці, што датычацца нарошчвання аб'ёмаў будаўніцтва жылля. Да 2011 года ў Беларусі павінна ўзводзіцца не менш як 10 млн кв.м штогод. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў, каб усе даручэнні, што датычацца нарошчвання аб'ёмаў будаўніцтва жылля, і ў цэлым інвестыцый у краіне, выканання нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва жылля і павышэння яго якасці, няўхільна выконваліся ўсімі органамі кіравання.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Жыхарка вёскі Ясень Пружанскага раёна Соф'я Зімніцкая з дзецьмі Юліяй і Віктарам на градзе з «неэкзатычным» ураджаем.*

## І ЗНОЎ «САЦРАБОТНІКІ»

**Даверлівасць сталічнай 84-гадовай пенсіянеркі вельмі дорага ёй каштавала: у старой з кватэры знікла шэсць з паловай мільёнаў рублёў.**

Крымінальнае здарэнне адбылося ў сераду ў дзве гадзіны дня ў адным з дамоў па 2-й вуліцы Шчорса. Бабулька ўпусціла ў кватэру дзвюх незнаёмых жанчын, якія адрэкамендаваліся «сацыяльнымі работнікамі». Чым скончыўся візіт прайдзісветак — ужо вядома. Сёлета толькі ў сталіцы падобных злачынстваў, ахвярамі якіх становяцца старыя людзі, зафіксавана дзесяткі. Аднак наіўнасць пенсіянераў, як бачна, бязмежная. Таму ў чарговы раз будзе няўлішнім нагадаць усім аб элементарных мерах перасцярогі ў падобных выпадках. Па-першае, трэба з асцярогай адчыняць дзверы сваіх кватэр незнаёмцам, нават калі яны называюць сябе сацработнікамі (альбо служачымі ЖЭС ці энерганагляду). У апошніх павінны быць на руках дакументы, якія пацвярджаюць іх прыналежнасць да той ці іншай установы. Аднак залішняя пільнасць і тут не перашкодзіць: можна патэлефанаваць і праверыць: а ці працуе згаданы работнік у арганізацыі. І яшчэ — не трэба выпускаць невядомых, што прыйшлі да вас, з поля зроку. Што ж датычыцца просьбаў, накшталт «прынясіце, калі ласка, вады», то трэба памятаць: злачынцу неабходна няшмат часу, каб завалодаць вашым багаццем...

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ДАПАМОГА ДЛЯ РОЛЕРАЎ

На пляцоўцы для экстрэмальных відаў спорту каля Палаца спорту будуць дзяжурыць медработнік і інструктар. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела па справах моладзі Мінгарвыканкама Віталь Брэль. Нагадаем, што пляцоўка была абсталявана і адкрыта летам. Каля Палаца спорту ўсталявалі поручні, горкі, тумбы для рэпетыцый трукаў на веласіпедах і скейтбордах. Рух скейтбардыстаў у Мінску з кожным годам набірае абароты.

**Вольга ШАЎЧУК, «Мінск—Навіны».**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### МУЖЧЫНЫ НЕ ПАСПЕЛІ І СПУЖАЦЦА

**Як адзін з іх, калі ўстанаўліваў тэлевізійную антэну на чацвёртым паверсе вышыннага дома ў Гомелі, сарваўся і паляцеў уніз. А там — дах аўтамабільнага магазіна. Магчыма, гэта і паслабіла ўдар, але ўсё роўна чалавек не мог самастойна выбрацца адтуль, бо атрымаў шматлікія пераломы. На дапамогу прыйшлі выратавальнікі, пацярпелы дастаўлены ў бальніцу.**

Як паведаміў нам кіраўнік прэс-цэнтра Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных здарэннях Руслан Габрылёў, дапамога выратавальнікаў спатрэбілася і пенсіянеру 70-гадовага ўзросту, якога ўпалае дрэва прыціснула да асфальту на праспекце Леніна. Ён таксама трапіў у бальніцу.

Спецыяльную тэхніку давялося прымяніць і тады, калі ў Жлобіне на чыгуначнай станцыі пры разгрузцы вагона рабочы «Гомельжылдартранса» апынуўся пад заваламі шчэбеню. І ў гэтым выпадку не абышлося без выратавальнікаў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### У ПЕНСІЯНЕРКІ СКРАЛІ ЗОЛАТА НА 13 МЛН

У Віцебску ўвечары абрабавалі кватэру пенсіянеркі — скралі больш за дваццаць залатых вырабаў і 5 тысяч расійскіх рублёў. Агульная страта — каля 14 мільёнаў беларускіх рублёў. Потым было ўстаноўлена, што на злачынства пайшоў раней судзімы за хуліганства 23-гадовы беспрацоўны. Узбуджана крымінальная справа.

### ПЧОЛЫ ЗГАРЭЛІ

У Аршанскім раёне ў вёсцы Бабінічы раніцай згарэлі шэсць дамкоў з пчоламі, што стаялі недалёка ад жылога дома. Пра гэта паведаміў у міліцыю гаспадар пасекі — пенсіянер. Устаноўлена, што прычына пажару — падпал. Страта — 1,3 мільёна беларускіх рублёў. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ДЫРЭКТАР ШКОЛЫ СКОЧЫЎ УНІЗ З ПЯТАГА ПАВЕРХА

І загінуў на месцы. Адбылася гэта трагедыя ў Гомелі на другі дзень новага навучальнага года, і цяпер устанаўліваюцца прычыны, як лічаць пракурорскія работнікі, самагубства. Справа ў тым, што школа, якая была адкрыта ў 1990 годзе, лічылася ў горадзе адной з лепшых, і педагагічны калектыў Васіль К. узначальваў з таго ж самага часу.

Вядома толькі, што ён скочыў з акна сваёй кватэры а дзесятай гадзіне, калі дома знаходзілася яго жонка. Вядзецца следства.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

**Кампанія БЕЛПІ — беларускі вытворца напояў з 1993 года — распачынае вытворчасць серыі настоек і шукае «Бабулю і Дзядулю» для правядзення дэгустацый.**

ПАТРАБАВАННІ ДА КАНДЫДАТАЎ:

- валоданне беларускай мовай;
- пачуццё гумару;
- санкніжка (за кошт прадпрыемства).

**Тэл.: (044) 773 78 41, (029) 566 28 99, Алесь.**
**E-mail: mila_alan@mail.ru**

УНН 100036927

## ШАНЦ НА ДЭПУТАЦТВА

Выбары-2008

### атрымалі па выніках пасяджэнняў ЦВК некаторыя незарэгістраваныя акруговымі камісіямі кандыдаты

Два дні запар пасяджэнні Цэнтрвыбаркама праходзілі фактычна ў рэжыме нон-стоп. Было разгледжана больш як 50 скаргаў тых кандыдатаў у дэпутаты, каму адмовілі ў рэгістрацыі акруговыя камісіі. Пасля пасяджэння 3 верасня ў палку прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат прыбыла пяцёра. Яшчэ трое далучыліся да іх учора. Яны вылучаліся ад акруг, утвораных у Гомельскай, Віцебскай, Мінскай абласцях і сталіцы. Практыка паказала, што пры праверцы звестак, пададзеных кандыдатамі, у розных ведамствах калі-нікалі ўзнікаюць тэхнічныя памылкі. У такіх выпадках Цэнтрвыбаркам прымае рашэнне зарэгістраваць кандыдата. У размове з журналістамі старшыня Цэнтральнай камісіі па правядзенні выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына падзялілася самай свежай навіной: учора сваё жаданне ўзяць удзел у назіранні за парламенцкімі выбарамі ў нашай краіне выказаў старшыня ЦВК Расіі Уладзімір Чураў. Пракаментавала спадарыня Ярмошына і надзённыя пасяджэнні Цэнтрвыбаркама:

— Адным з самых радасных момантаў з'яўляецца тое, што адмоў у рэгістрацыі значна менш, чым у папярэднія гады. І сённяшняя большая частка рашэнняў, якія прадстаўляюцца на суд Цэнтральнай камісіі, з'яўляюцца абгрунтаванымі. Галоўная тэндэнцыя — гэта паляпшэнне якасці работы нашых арганізатараў выбараў увогуле.

Л. Ярмошына адзначыла, што кандыдаты дапускалі адны і тыя ж памылкі.

— Асабліва ў горадзе Мінску гэта масавая з'ява — прававая неадукаванасць кандыдатаў і іх ініцыятыўных груп. Не там збіралі, не там завяралі, не тыя здавалі — і гэтак далей. Уключалі ў адны і тыя ж падпісныя лісты подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць у розных раёнах горада, або ўключалі подпісы тых, хто пражывае па-за тэрыторыяй выбарчай акругі, ад якой вылучаўся кандыдат.

— Расце наш сярэдні клас, расце іх багацце, — дадала старшыня ЦВК. — Таму кандыдаты ўсё часцей забываюць аб маёмасці, набытай у 1990-я гады. Штосьці з заснавання знаходзіцца на стадыі ліквідацыі.

Аднак акрамя выпадкаў, калі кандыдаты забываюць (выпадкова або наўмысна) указаць нешта ў дэкларацыях аб даходах і маёмасці, здараецца і так, што кандыдаты хлусяць, хто праўдзе.

— Нават суды памыляюцца. Вядома ж, памылкі ёсць і ў выбарчых камісій, — канстатавала Лідзія Ярмошына. — Самая галоўная памылка — няправільная праверка тых дакументаў, якія прадстаўляюцца кандыдатамі. Учора па гораду Мінску мы аднавілі ў правах аднаго з кандыдатаў (гэта была жанчына), паколькі акруговая выбарчая камісія ўзяла для праверкі няправільны працэнт подпісаў у яе падтрымку.

Шанц на дэпутацтва ўсё яшчэ застаецца і ў тых незарэгістраваных кандыдатаў, каму адмовілі і ў Цэнтральнай камісіі. Яны могуць абскардзіць гэта рашэнне ў Вярхоўным судзе краіны ў трохдзённы тэрмін.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БЕЛЬГІЙСКІ СЕНАТАР НАЗВАЎ СААКАШВІЛІ «ВАЕННЫМ ЗЛАЧЫНЦАМ» І «ПОЎНЫМ ВАР'ЯТАМ»

**Ваенным злачынцам назваў прэзідэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі намеснік старшыні камісіі Сената Бельгіі па міжнародных справах і абароне Жазі Дзюб'е. Адзначым, у чацвер на сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам ЗША Дзікам Чэйні Саакашвілі абвінаваціў Расію ў этнічных чыстках.**



«Саакашвілі, які нясе галоўную адказнасць за гэты вэрхал (грузінскую ваенную аперацыю ў Паўднёвай Асеціі), з'яўляецца ваенным злачынцам і да таго ж поўным вар'ятам, і ён павінен успрымацца менавіта так», — піша сенатар у артыкуле, апублікаваным бельгійскай газетай Le Soir.

«Пачаўшы ўначы ў дзень адкрыцця Алімпійскіх гульняў у Пекіне свой «Бліцкрыг», а затым акупаваўшы Цхінвалі танкамі, ён разгульваў партыю ў покер, наіўна лічачы, што ўцягне «вольны свет» у свой нацыяналісцкі крыжовы паход», — адзначае Дзюб'е.

Сенатар піша пры гэтым, што Саакашвілі сплانаваў агрэсію загадзя, пра што сведчыць велізарная колькасць зброі, пастаўленай краінамі ЕС і Ізраілем, а таксама прысутнасць у Грузіі шматлікіх амерыканскіх і ізраільскіх ваенных дарадцаў.

«Застаецца спадзявацца, што грузіны пасля таго, як яны, нарэшце, ацэняць ступень таго бедства, у якое іх пагрузіў крывавы авантурызм іх прэзідэнта (увесь свет бачыў, як ён, разгублены, жаваў свой гальштук), пазбавяцца ад яго дэмакратычным шляхам як мага хутчэй», — піша Дзюб'е. Ён перакананы, што менавіта прызнанне краінамі Захаду незалежнасці Косава адкрыла «скрыню Пандоры» і пацягнула за сабой прызнанне Расіяй незалежнасці Паўднёвай Асеціі і Абхазіі.

### БАРАДЗІН ПРАДКАЗАЎ ДАЛУЧЭННЕ АБХАЗІІ І ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ ДА САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ



**Ужо да канца гэтага года прызнаныя Расіяй Абхазія і Паўднёвая Асеція змогуць стаць паўнапраўнымі членамі Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Аб гэтым у эфіры радыёстанцыі «Рэха Масквы» заявіў дзяржсакратар СД Павел Барадзін.**

Пры гэтым ён падкрэсліў, што гаворка ідзе не аб палітыцы, не аб захопе тэрыторый, а пра чыста эканамічны аспект, і, у першую чаргу, аб стварэнні працоўных месцаў для жыхароў Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Гэты крок не супярэчыць ніякім міжнародным законам, адзначыў Барадзін.

### БЛОК ЦІМАШЭНКІ ЗАПАТРАБАВАЎ ДАТЭРМІНОВЫХ УСЕАГУЛЬНЫХ ВЫБАРАЎ ВА УКРАІНЕ

**Старшыня фракцыі Блока Юліі Цімашэнкі ў Вярхоўнай Радзе Украіны Іван Кірыленка выступіў за адначасовае правядзенне датэрміновых парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў у снежні 2008 года.**



«Народ хай скажа сваё меркаванне па тым, што адбываецца. Трэба правесці ў адзін дзень выбары і парламенцкія, і прэзідэнцкія датэрмінова ў снежні гэтага года», — сказаў Кірыленка журналістам у чацвер.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

на право заключения договора аренды земельного участка площадью 1,0164 га сроком на 99 лет для строительства объекта придорожного сервиса, расположенного по адресу: Воложинский район, вблизи автомобильной дороги М-6 Минск – Гродно на 75 км. около заправки «Лукойл». Кадастровый номер земельного участка 622000000001000521. Начальная цена предмета аукциона – 2 690 679 бел. рублей. Земельный участок имеет ограничения в использовании земель (0,1586 га – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт). Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 26 365 360 рублей, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы в сумме 2 178 596 рублей, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей. Иные обязанности победителя аукциона и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком. Задаток в сумме 260 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Аукцион состоится **10.10.2008 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **09.10.2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015

Рэпартаж з колаў

## «...Пакуль сама не выйграла — не верыла...»

**Так атрымалася, што чарговая паездка звяздоўцаў у межах падпісной кампаніі прайшла ў скарочаным складзе. Дакладней — удвух. Галоўным пунктам нашага прызначэння значыўся Салігорскі раён, вёска Хорастава, дзе наша даўняя чытачка чакала выйграны тэлевізар. Па дарозе мы не маглі абмінуць Узду і Капыль, дзе нанеслі візіт ветлівасці ў мясцовыя адміністрацыі і паштовыя аддзяленні — з новымі людзьмі пазнаёміліся, з сябрамі павіталіся, а заадно пацікавіліся тэмпамі падпісной кампаніі.**



— А дзе ваша Валянціна Доўнар, дзе Яўген Пясецкі, Анатоль Кляшчук? — адразу спыталі ў нас уздзенскія паштавікі. — Чаму больш не заязджаеце да нас праводзіць Дзень падпісчыка? Нам так спадабалася, як гэта атрымалася ў мінулы раз...

Сапраўды, разгорнутае мерапрыемства, якое афіцыйна называецца Дзень падпісчыка і ўключае ў сябе сустрэчу з даўнімі прыхільнікамі газеты, выступленне журналістаў, правядзенне віктарыны на веданне гісторыі «Звязды» і шмат паказак і баек, якія майстар расказваць Валянціна Аркадзьеўна, мы праводзілі тут больш за год таму. І вельмі прыемна, што да гэтай пары ў людзей засталіся добрыя ўспаміны аб гэтай сустрэчы, фотаздымкі. Значыць, у нас атрымалася стварыць для чытачоў свята, аддзячыць за вернасць газеце добрым настроем і станоўчай энергетыкай. Абяцаем у хуткім часе прыехаць да уздзенскіх падпісчыкаў у поўным складзе «баявой» звяздоўскай брыгады, «адтанцаваць» па-поўнай.

— А наконт падпіскі вы не хвалюйцеся, — запэўніла нас начальнік раённага вузла паштовай сувязі Надзея Левандоўская, — план па «Звяздзе» мы заўсёды «закрываем». Найбольш актыўна зараз падпіска ідзе ў паштовых аддзяленнях Целякова, Лоша, Нёман, Войкава, Літвяны, Слабада, Узда. Агульная колькасць падпісчыкаў на 1 верасня складала 438 чалавек.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## «ПЕНСІЙНЫ ПІРОГ»: ЯК ЯГО РАЗДЗЯЛІЦЬ, КАБ НІКОГА НЕ АБДЗЯЛІЦЬ...

**Пенсіі ў Беларусі на працягу апошніх гадоў выплачваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме, а па іх памеры (у доларавым эквіваленце) наша рэспубліка знаходзіцца ў ліку лідараў сярод краін СНД. Гэта сведчыць аб стабільнасці пенсійнай сістэмы, аднак зусім не выключае неабходнасці яе ўдасканальвання. Аб гэтым — у гутарцы карэспандэнта БЕЛТА з намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Валянцінай КАРАЛЁВАЙ.**

***— Якія ж асноўныя напрамкі развіцця пенсійнай сістэмы на перспектыву?***

— Прынцыпова важны крок у гэтым напрамку — прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прафесійным пенсійным страхаванні», у адпаведнасці з якім з 1 студзеня 2009 года пачне фарміравацца асобная крыніца фінансавання датэрміновых пенсій па ўмовах працы. З аднаго боку, гэта будзе садзейнічаць аздараўленню вытворчага асяроддзя, з іншага — паступова вызваліць агульную пенсійную сістэму ад фінансавання асноўнай часткі ранніх пенсій.

Наступны істотны крок у пераўтварэннях у адпаведнасці з праграмнымі дакументамі — увядзенне да канца пяцігоддзя ў пенсійную сістэму ўмоўна-накапляльных рахункаў. Будуць зменены падыходы да вылічэння пенсіі ў бок большай увязкі яе памеру з аб'ёмам узносаў работніка на пенсійнае страхаванне і створаны стымулы да больш працяглай працоўнай дзейнасці. У сваю чаргу, аддаленне звароту па пенсію на больш позні ўзрост будзе садзейнічаць змяненню нядобрай тэндэнцыі росту колькасці пенсіянераў адносна колькасці занятых на рынку працы, а ў канчатковым выніку — зніжэнню нагрузкі на эканоміку.

Асноўная стратэгічная задача рэфармавання — стварэнне шматузроўневай пенсійнай сістэмы. Пры гэтым плануецца, што накапляльныя механізмы асноўнае прымяненне знойдуць у рамках менш маштабных дадатковых пенсійных схем. Дарэчы, праграмы, заснаваныя на накапленні сродкаў на будучыя пенсіі, ужо сёння прапануюцца страхавымі арганізацыямі. Аднак удзел у іх не атрымаў масавага характару. Адзначу, што сфера фінансавага рынку да сацыяльнага страхавання не адносіцца.

*(Заканчэнне на 7-й стар.)*

## «АРАНЖАВАЯ ПРЫНЦЭСА» СВАЙГО НЕ САСТУПІЦЬ

**Змучаная пакутамі палітычнай барацьбы Украіна ўцягваецца ў новы крызіс улады, які адначасова стаў і нефармальным стартам прэзідэнцкай гонкі 2010 года.**

Праўда, назваць новым крызіс можна вельмі ўмоўна. Супрацьстаянне двух таленавітых, яркіх і ў пэўным сэнсе харызматычных лідараў Віктара Юшчанкі і Юліі Цімашэнкі акрэсліліся яшчэ ў час іх сумеснага стаяння на Майдане, калі яны радасныя і шчаслівыя атрыманай перамогай над Віктарам Януковічам, галоўным канкурэнтам у бітве за прэзідэнцкую пасаду, трымаліся за рукі і спявалі «Шчэ не вмерла Украіна». Але ўжо тады было бачна, што надзвычай амбіцыйная Ю. Цімашэнка ў асабістай кар'еры не супыніцца на дасягнутым. Так яно і атрымалася.

Даволі хутка раз'юшаны празмернай (на мяжы публічнага выкліку) самастойнасцю і, скажам так, неардынарнасцю паводзінаў прэм'ер-міністра Ю. Цімашэнкі, прэзідэнт В. Юшчанка з трэскам зняў яе з высокай пасады. Для іншага палітыка гэта быў бы канец кар'еры, але толькі не для Ю. Цімашэнкі. Яе каманда ўдала правяла датэрміновыя парламенцкія выбары і ўжо ў новым складзе Вярхоўнай Рады «аранжавая прынцэса» з'явілася ва ўсім бляску лідара ўплывовай палітычнай сілы. І прэзідэнту В. Юшчанку нічога не заставалася, як зноў прапанаваць ёй месца прэм'ер-міністра. Ведаў выдатна, чым яму гэта пагражае, але іншага выйсця ў той сітуацыі не было.

Такім чынам у Кіеве зноў утварыліся перадумовы для развіцця двухуладдзя. Хай і нябачнага для многіх, але ўсё ж моцна дэстабілізуючага сістэму ўлады ў краіне.

Амаль з самага пачатку свайго другога прэм'ерскага тэрміну Ю. Цімашэнка пад розным выглядам старалася данесці да электарата адну важную, на яе погляд, думку: В. Юшчанка не той кіраўнік, які патрэбны Украіне. Гэтаму спрыяў, дарэчы, невысокі рэйтынг дзеючага прэзідэнта.

І вось цяпер, відаць па ўсім, яна вырашала, што надышоў час для рашучых дзеянняў. Каманда Ю. Цімашэнкі сёння ўмела, надзвычай актыўна і нават вынаходліва выкарыстоўвае ў сваіх мэтах памылкі і пралікі В. Юшчанкі як ва ўнутранай, так і ў знешняй палітыцы. Напрыклад, празмерную арыентаванасць на ЗША, нежаданне канструктыўна працаваць з Масквой, адназначную падтрымку Грузіі ў нядаўнім ваенным канфлікце і г. д.

На мой погляд, паліттэхнолагі блока Ю. Цімашэнкі справакавалі выхад з «аранжавай кааліцыі» прыхільнікаў В. Юшчанкі. Той у адказ абвінаваціў былую паплечніцу ў перавароце і змове. Таксама прэзідэнт заявіў, што, згодна з канстытуцыяй, ён будзе вымушаны распусціць Вярхоўную Раду і назначыць новыя выбары.

Са свайго боку Ю. Цімашэнка заклікае верных прэзідэнту дэпутатаў вярнуцца ў кааліцыю і тым самым пазбегнуць датэрміновых парламенцкіх выбараў і разам працаваць на Украіну. Хоць адказнасць за раскол кааліцыі, па яе словах, персанальна ляжыць на прэзідэнце. Ён, адкрывае вялікую тайну электарату сваім мяккім прыемным голасам «аранжавая прынцэса», аб'явіў вайну на знішчэнне ўсёй дэмакратычнай камандзе і ёй асабіста. Прычына — пачатак барацьбы на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года, лічыць яна. На іх, як поўнасцю аддан інтарэсам народа палітык, Ю. Цімашэнка гатовая падтрымаць адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў. Няцяжка здагадацца, што такім адзіным кандыдатам, хутчэй за ўсё, стане сама Ю. Цімашэнка.

Заходнія сябры неаднойчы мірылі гэтых абодвух «несумяшчальных» украінскіх палітыкаў. Можа і зараз віцэ-прэзідэнту ЗША Дзіку Чэйні, у планах якога наведванне Кіева, удасца дапамагчы В. Юшчанку і Ю. Цімашэнцы аб'яднацца «перад тварам расійскай пагрозы». Хоць гэта, безумоўна, будзе нялёгкая справа.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

| *Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.09.2008 г. (для б/н разлікаў)* | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 |
| 1 еўра | 3 067,71 |
| 1 латвійскі лат | 4 359,32 |
| 1 літоўскі літ | 888,62 |
| 1 чэшская крона | 124,13 |
| 1 польскі злоты | 909,74 |
| 1 расійскі рубель | 83,72 |
| 1 украінская грыўня | 446,30 |

| *Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў* | |
|---|---|
| **Цэнтрабанк РФ** | |
| USD | 25,2144 |
| 10 UAH | 53,2511 |
| 1000 BYR | 11,9386 |
| EUR | 36,5937 |
| ***Курс у гандлёвых кампаніях (на 04.09.2008 г.)*** | |
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

08167>

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

5

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ВЕРАСНЯ 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 35 (15539)

## РАЗАМ ЗА БЯСПЕКУ І ПРАВАПАРАДАК

**Мінскі гарадскі камітэт БРСМ пры падтрымцы Мінгарвыканкама і ГУУС Мінгарвыканкама праводзяць акцыю «Разам за бяспеку і правапарадак».**

Акцыя стартавала ў дзень ведаў цырымоніяй уручэння пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і пасведчанняў дружынніка БРСМ. На жаль, але менавіта ў пачатку навучальнага года кожны раз адбываецца ўсплеск дарожна-транспартных здарэнняў у маладзевым асяродку. З мэтай прафілактыкі ўвесь тыдзень актывісты БРСМ усіх раёнаў г. Мінска будуць несці службу па ахове правапарадку ў месцах масавага адпачынку моладзі і браць удзел у забеспячэнні бяспекі дарожнага руху. Аднак кіроўцам варта быць больш уважлівымі паблізу школ, кінатэатраў, паркаў, прыпынкаў грамадскага транспарту. А маладым грамадзянам не варта быць бестурботнымі і спадзявацца на волю выпадку. Прытрымліванне элементарных правілаў дарожнага руху дазваляе паменшыць узровень траўматызму на дарогах.

**Ірына ЛЯШКЕВІЧ.**

## ПЛЮС БРОНЗАВЫ МЕДАЛЬ

Апошнюю кропку ў выступленнях беларускіх школьнікаў у міжнародных алімпіядах па вучэбных дысцыплінах паставілі ўдзельнікі нацыянальнай зборнай па астраноміі. З Інданезіі нашы школьнікі прывезлі адзін бронзавы медаль. Яго ўладальнікам стаў выпускнік мінскай сярэдняй школы № 51 Мікіта Ведзянееў. Сёння ён ужо з'яўляецца першакурснікам Белдзяржуніверсітэта.

Усяго ўдзел у міжнароднай алімпіядзе ўзялі прадстаўнікі 23 краін свету. Беларускія школьнікі ўдзельнічалі ў алімпіядзе толькі ў другі раз і, як кажуць, набіраліся вопыту. Тым чынам, па выніках мінулага лета скарбонку беларускай школы папоўнілі 24 медалі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## КОЖНАМУ — ЗАНЯТАК ПА ДУШЫ

**З 5 па 12 верасня ў Беларусі пройдзе Рэспубліканскі тыдзень пазашкольнага выхавання. Яго ўрачыстае адкрыццё адбудзецца 5 верасня ў Гомелі, дзе будуць арганізаваны выставы творчых работ, паказальныя выступленні па турыстычна-прыкладных і тэхнічных відах спорту, вялікая канцэртная праграма і наведванне пазашкольных установаў у Гомелі і Рэчыцы.**

На сёння ў нацыянальнай сістэме адукацыі дзейнічаюць 366 устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, якія ахопліваюць больш як 384 тысячы чалавек. На іх базе пастаянна працуюць 29 905 гурткоў і іншых аб'яднанняў па інтарэсах. Фактычна заняткамі па інтарэсах ахоплены кожны трэці беларускі школьнік. За апошнія тры гады ў Беларусі было адкрыта больш як 2 тысячы новых аб'яднанняў па інтарэсах, а колькасць дзяцей, ахопленай сістэмай пазашкольнага выхавання, павялічылася за апошнія пяць гадоў на 40 тысяч чалавек.

Рэспубліканскі тыдзень пазашкольнага выхавання праводзіцца ў Беларусі ўжо чацвёрты год запар. Плануецца, што на працягу сямі дзён на ўсіх пазашкольных установах пройдуць Дні адчыненых дзвярэй, рэкламна-інфармацыйныя кампаніі і акцыі, выставы-кірмашы, конкурсна-гульнявыя і канцэртныя праграмы, выступленні творчых калектываў, метадычныя семінары і канферэнцыі. Да таго ж педагогі ўстаноў пазашкольнага выхавання абавязкова наведаюць школы, каб сустрэцца з дзецьмі і прыцягнуць іх у аб'яднанні па інтарэсах. У рамках Тыдня будуць адкрыты таксама аб'яднанні па інтарэсах пазашкольных устаноў на базе агульнаадукацыйных устаноў у сельскай мясцовасці, і перш за ўсё — у аграгарадках.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ДЭМАКРАТЫЯ ДЛЯ ЮНЫХ ЛІДАРАЎ

**У Віцебскім раёне на базе летніка «Бярозка» прайшла абласная лідарская лагерная змена для актывістаў БРСМ з усіх рэгіёнаў вобласці.**

Як расказала нам кіраўнік змены Ганна Піменава, каля 90 удзельнікаў ва ўзросце ад 13 да няпоўных 18 гадоў жылі па вельмі дэмакратычных законах. Стварылі шматузроўневыя структуры ўлады самакіравання. Актывісты самі прыдумвалі сцэнарыі мерапрыемстваў, удзельнічалі ў іх. Вывучалі нюансы псіхалогіі, дыскусіравалі на самыя розныя тэмы.

Асабліва запомніўся візіт гасцей — воінаў 103-й мабільнай брыгады, якія разам гулялі ў «Зарніцу». Развіталіся з надзеяй сустрэцца зноў у наступным годзе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ФІНАЛІСТЫ «СКУРАНОГА МЯЧА» СПАБОРНІЧАЮЦЬ У ГРОДНЕ



Фота БЕЛТА.

**З 2 па 6 верасня ў Гродне праводзіцца 1-ы фінал рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па футболе «Скураны мяч». Другі год запар спаборніцтвы праходзяць на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.**

Урачыстая цырымонія адкрыцця фіналу адбылася 3 верасня на запасным полі «ЦСК Нёман». За «золата» турніру змагаюцца каманды, якія сталі пераможцамі кожнай вобласці і сталіцы. Гэта «Каласок» Аршанскага раёна (Віцебская вобласць), каманда Баранавічаў (Брэсцкая вобласць), каманда Цэнтральнага раёна Гомеля, лідскае «Юнацтва» (Гродзенская вобласць), маладзечанскі «Агеньчык» (Мінская вобласць), магілёўскі «Вымпел» і дзве каманды з Мінска (Фрунзенскага і Заводскага раёнаў). У турніры бяруць удзел юныя футбалісты 1996/97 г.н. Пераможцам гарантаваны каштоўныя прызы, а ўсім удзельнікам — памятныя сувеніры ад рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб». Арганізатарамі па традыцыі выступаюць таксама Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола».

**Алена КРАВЕЦ.**

# З ДЗЁННІКА ЗВЫЧАЙНАГА СТУДЭНТА

***«Дарагія студэнты, наступны раз мы сустракаемся з вамі толькі на заліку, гэта будзе на наступным тыдні. Пастарайцеся падрыхтавацца як след...» Падобныя словы чуе, бадай, кожны студэнт мінімум раз на месяц падчас семестра. Найбольш сумленныя, выходзячы з аўдыторыі, даюць сабе слова, што абавязкова ўсё вывучаць і нарэшце блiснуць ведамі перад аднагрупнікамі. Другія, не вельмі сумленныя студэнты, ужо дамаўляючыся наконт білетаў на бліжэйшую дыскатэку, скажуць, што ў запасе яшчэ цэлых сем дзён...***

***Тое, што здаваць залік прыйдуць усе — зразумела, толькі вось падрыхтоўка ў кожнага свая. Шкада, што выкладчыкі гэтага часам не хочуць зразумець. Але паспрабуем зазірнуць у жыццё сярэднестатыстычнага студэнта, убачыць яго «зборны» вобраз і паглядзець, як праходзіць яго падрыхтоўка да заліку...***

Залікі бываюць розныя. Але факт застаецца фактам: не атрымаўшы залік, да сесіі можаш не дапусціцца. Дысцыпліны, па якіх праводзяцца залікі — таксама разнастайныя: ад вышэйшай матэматыкі, квантавай механікі і найноўшых тэлекамунікацыйных тэхналогій да прыродазнаўства, антычнай літаратуры і інфарматыкі. На кожным факультэце — свае асаблівасці. Але возьмем хоць бы залік па беларускай літаратуры.

Напэўна, няма больш шчаслівых у гэтым плане студэнтаў, як філолагі, але не ім адным так пашчасціла. Студэнты журфака, прынамсі, таксама не абдзеленыя «літаратурнай» увагай.

Задача да заліку: як мага больш грунтоўна падрыхтавацца, вывучыўшы асобныя пункты біяграфіі пісьменнікаў, перачытаўшы найбольш значныя творы мастакоў роднага слова і маючы ўяўленне пра той літаратурны асяродак, у якім жылі і тварылі будучыя класікі.

Стоячы на прыпынку ў чаканні транспарту, усё часцей звяртаеш увагу на свой страўнік, які, «спяваючы сімфоніі» галоднаму гаспадару, бурчыць і клёкае.

«Заўтра не буду эканоміць, хопіць быць скнарай. Для чалавека самае важнае — здароўе, — падбадзёрваю сябе і ўваходжу ў магазін.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

## «ГЛАБАЛЬНЫ» КОНКУРС

**Дзеці і падлеткі з усіх краін свету ад 5 да 13 гадоў запрашаюцца да ўдзелу ў глабальным конкурсе, які прысвечаны праблемам змены клімату на планеце.**

Конкурс у 18-ы раз праводзіць Праграма ААН па навакольным асяроддзі (ЮНЕП) і японскі фонд «За глабальны мір і навакольнае асяроддзе». Летась у конкурсе ўдзельнічалі 15 550 юных мастакоў з 90 краін. Сёлета ў ходзе конкурсу будуць вызначаны адзін глабальны і шэсць рэгіянальных пераможцаў. Іх чакаюць грашовыя прызы: глабальны пераможца атрымае 2000 долараў ЗША, а кожны з рэгіянальных — па 1000. Акрамя гэтага, усім лаўрэатам будзе аплачана паездка на міжнародную дзіцячую канферэнцыю «Tunza» 2009 года з адным дарослым суправаджальнікам. Аб месцы яе правядзення будзе паведамлена дадаткова. Свае працы юныя мастакі павінны прадаставіць у мясцовае прадстаўніцтва ЮНЕП да 15 студзеня 2009 года.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## Супраць гендарных стэрэатыпаў

**Мільёнам маладых людзей па-ранейшаму цяжка ўладкавацца на працу.**

Да такой высновы прыйшлі эксперты Міжнароднай арганізацыі працы (МАП). З гэтай нагоды яна заклікала ўрады краін свету звярнуць увагу на праблемы занятасці моладзі, папярэдзіць нарастаючы ў гэтай сферы крызіс. Бо, па разліках МАП, на працягу бліжэйшага дзесяцігоддзя адзін мільярд маладых людзей дасягне працаздольнага ўзросту. Ім усім давядзецца шукаць работу.

Асаблівыя цяжкасці ў гэтай справе чакаюць дзяўчат і маладых жанчын. Яны даволі часта сутыкаюцца на рынку працы з дыскрымінацыяй, ім вельмі часта плацяць менш, чым хлопцам за аднолькавую працу. Таму МАП рашуча выступае за роўныя магчымасці атрымання адукацыі для хлопчыкаў і дзяўчатак і наступнага працаўладкавання. Арганізацыя заклікае да пераадолення стэрэатыпаў наконт «мужчынскіх» і «жаночых» прафесій і відаў працы.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ І РАСІІ: У БУДУЧЫНЮ — РАЗАМ

**Сёлета Растоў-на-Доне прыме трэці фестываль «Моладзь за Саюзную дзяржаву». Як і заўсёды, форум збярэ вялікую колькасць удзельнікаў і гасцей. На свята моладзі завітаюць юнакі і дзяўчаты з розных рэгіёнаў Расіі і Беларусі.**

У рабоце фестывалю таксама возьмуць удзел дэпутаты Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, члены Камітэта Дзяржаўнай Думы Расіі па справах моладзі, дзяржаўныя, грамадскія і палітычныя дзеячы, прадстаўнікі маладзёжных аб'яднанняў дзвюх краін, мастацкія калектывы, студэнты, удзельнікі і пераможцы конкурсных мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы, вядомыя артысты.

Як адзначаюць арганізатары, яны імкнуцца дапамагчы маладым людзям дзвюх краін адчуць сябе паўнацэннымі ўдзельнікамі палітычнага і грамадскага жыцця і актыўна ўключыцца ў працэс будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Фестываль павінен паказаць не толькі ўзрастаючую ролю маладога пакалення ва ўсіх сферах жыцця сучаснага грамадства, але і навучыць упэўнена дэманстраваць сваю грамадзянскую пазіцыю. Фестываль мае на мэце яшчэ больш умацаваць дружбу моладзі дзвюх краін, захаваць і развіць лепшыя традыцыі ў галіне культуры і мастацтва, раскрыць новыя таленты.

Праграма фестывалю насычана мерапрыемствамі. Пачнецца першы дзень маладзёжнай акцыяй «Мы светлай памяці верныя». Юнакі і дзяўчаты ўскладуць кветкі ля абеліска Славы да Вечнага агню. У гэты ж дзень пройдзе вечар знаёмства моладзі і жараб'ёўка ўдзельнікаў конкурсу выканаўцаў маладзёжнай песні.

Урачыстае адкрыццё форуму і гала-канцэрт артыстаў і творчых калектываў Беларусі і Расіі адбудзецца ўвечары 12 верасня. У наступныя дні пройдуць тэматычныя вечары, кірмаш маладзёжных ініцыятыў, прэзентацыя маладзёжных арганізацый, сумеснае пасяджэнне Савета маладых заканадаўцаў Паўднёвай Федэральнай акругі і Савета па прадпрымальніцтве пры Адміністрацыі Растоўскай вобласці. Таксама ў рамках фестывалю запланаваны прэс-канферэнцыя, сумесныя пасяджэнні і сустрэчы лідараў маладзёжных арганізацый і творчай моладзі з дэпутатамі нацыянальных парламентаў Беларусі і Расіі.

Дадам, сёлета фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» пройдзе ў Растове-на-Доне з 11 па 17 верасня. І на цэлы тыдзень расійскі горад стане цэнтрам маладзёжных ініцыятыў і творчасці.

**Святлана СУХАРКО.**

Зваротная сувязь

# БАРАЦЬБА ЗА ГАРАНТЫІ

**Ужо месяц прайшоў, як учарашнія студэнты зрабілі крок у дарослае жыццё. Першае працоўнае месца, першая зарплата... Не сакрэт, што без салiднага працоўнага стажу атрымаць вялікую суму грошай амаль нерэальна. Але дзяржава прадугледзела гэта і паклапацілася пра маладых спецыялістаў. Толькі вось, мяркуючы па зваротах чытачоў, не ўсе адчулі гэты клопат...**

**Аб гарантыях, якія павінны прадстаўляцца маладым спецыялістам, расказвае намеснік старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА.**

***«Я на працягу года сумяшчала вучобу з работай. Пасля таго, як атрымала дыплом аб заканчэнні навучальнай установы, была размеркавана на тое прадпрыемства, дзе працавала і раней. Ліпеньскі адпачынак, які гарантаваны кожнаму выпускніку, не скарыстала. Ці павінны мне ў гэтым выпадку выплаціць грашовую дапамогу ў памеры месячнай стыпендыі?»***

**Таццяна С.**

— Пасля заканчэння навучальнай установы адукацыі, згодна з **Палажэннем аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі**, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю, маладому спецыялісту прадстаўляецца адпачынак працягласцю адзін каляндарны месяц (выпускнікі, якія атрымалі адукацыю па педагагічных спецыяльнасцях прыступаюць да працы на 15 дзён пазней). За гэты адпачынак яны ў абавязковым парадку атрымліваюць грашовую дапамогу ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай ім у апошнім семестры, а тым, хто атрымаў прафесійна-тэхнічную адукацыю, — з разліку тарыфнай стаўкі па прысвоенай ім кваліфікацыі, разрадзе, класе, катэгорыі ці адпаведным акладзе. Выплата грашовай дапамогі ажыццяўляецца наймальнікам (маладым педагогам грашовая дапамога выплачваецца за кошт сродкаў рэспубліканскага ці мясцовых бюджэтаў установай адукацыі, якую яны скончылі) у месячны тэрмін пасля заключэння працоўнага дагавора ці кантракта ў поўным памеры незалежна ад колькасці выкарыстаных ім дзён адпачынку. Прычым у выпадку, калі маладыя спецыялісты не атрымлівалі стыпендыю ў апошнім семестры перад выпускам, грашовая дапамога за перыяд адпачынку ім выплачваецца ў памеры сацыяльнай стыпендыі, які ўстаноўлены на дату выпуску.

***— Пасля заканчэння БНТУ, я быў размеркаваны ў сталічную дзяржаўную ўстанову. Бацькі пражываюць у Віцебскай вобласці. Наколькі я ведаю, іншагароднім маладым спецыялістам павінны выплачваць «пад'ёмныя». Прапрацаваў месяц — і ніякай матэрыяльнай дапамогі не атрымаў...»***

**Віктар К.**

— Такога паняцця, як «пад'ёмныя» сёння не існуе. Хлопец, напэўна, меў на ўвазе выплаты, якія гарантуюцца маладым спецыялістам у сувязі з пераездам. Умовы гэтых выплат прапісаны ў артыкуле 96 Працоўнага кодэкса «Кампенсацыі ў сувязі з пераездам на работу ў іншую мясцовасць». Тут сказана, што асобам, якія завяршылі навучанне і пераязджаюць на працу ў іншую мясцовасць у сувязі з пераводам, накіраваннем у адпаведнасці з папярэдняй дамоўленасцю, заключанымі дагаворамі ці заяўкамі кампенсуюцца:

— кошт праезду на тых жа ўмовах, што і пры накіраванні работніка ў службовую камандзіроўку;

— выдаткі па правозе маёмасці транспартам агульнага карыстання ў колькасці да 500 кілаграмаў на работніка і да 150 кілаграмаў на кожнага члена сям'і;

— сутачныя за кожны дзень знаходжання ў дарозе ў адпаведнасці з заканадаўствам аб службовых камандзіроўках;

— аднаразовая дапамога на работніка ў памеры яго месячнай тарыфнай стаўкі (акладу) па новым месцы працы і на кожнага пераязджаючага члена сям'і ў памеры адной чацвёртай дапамогі на работніка.

Акрамя таго, у заробак уключаюцца выдаткі за дні збору ў дарогу, знаходжання ў ёй і ўладкавання на новым месцы жыхарства, але не больш, чым за шэсць дзён

Сёння амаль усе маладыя спецыялісты пераязджаюць (пераезд не ажыццяўляюць толькі тыя, хто скончыў установу адукацыі, якая знаходзіцца ў горадзе яго пастаяннага месцажыхарства і быў размеркаваны ў той жа горад). Нават, калі выпускнік сталічнай ВНУ размеркаваны ў мінскую арганізацыю, то ўсё роўна факт пераезду маецца, бо ён у час адпачынку пражывае ў бацькоў. Таму адмаўляць у прадстаўленні такіх кампенсацый на той падставе, што малады спецыяліст размеркаваны ў горад, дзе вучыўся ўсе пяць гадоў, фактычна неправамоцна.

**— На якія яшчэ гарантыі можа разлічваць малады спецыяліст?**

— У калектыўных дагаворах могуць быць прапісаны пункты, у адпаведнасці з якімі маладым спецыялістам могуць выплачвацца нейкія іншыя гарантыі і кампенсацыі. Напрыклад, калектыўны дагавор можа ўтрымліваць пазіцыю наконт кампенсацыі праезду маладому спецыялісту, які ездзіць на працу з раённага цэнтра ў вёску ці наадварот, пры адсутнасці магчымасці прадастаўлення яму жылля.

Мы звычайна праводзім экспертызы калектыўных дагавораў, якія дзейнічаюць у нашай галіне, правяраем, ці няма там нейкіх абмежаванняў па выплатах маладым спецыялістам і маладым работнікам адносна дзеючага заканадаўства. Прынамсі, некаторыя калектыўныя дагаворы ўтрымлівалі пазіцыю, што матэрыяльная дапамога ці прэміяванне маладых спецыялістаў ажыццяўляецца пасля пэўнага перыяду работы ў арганізацыі. Такога абмежавання ў заканадаўстве няма, таму ўсім такім арганізацыям было рэкамендавана ўнесці адпаведную змену ў калектыўны дагавор.

Цяпер нашы намаганні накіраваны на тое, каб маладым спецыялістам прадастаўляліся кампенсацыі пры найме жылля. Хоць адпаведнай ільготай можна лічыць тое, што ўжо зараз грамадзяне, якія здаюць жыллёвае памяшканне маладым спецыялістам, вызваляюцца ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта ад падаходнага падатку. Гэта льгота значна спрасціла жыццё як маладым спецыялістам, так і людзям, якія хочуць здаць жылое памяшканне.

**— Што трэба рабіць маладому спецыялісту, які вырашыў адстаяць свае правы?**

— Першапачаткова трэба звярнуцца да наймальніка (а не да бухгалтара, як робяць многія). І лепш за ўсё зрабіць гэта ў пісьмовым выглядзе — напісаць заяву. У тым выпадку, калі наймальнік напісаў «адмовіць», а вы лічыце, што маеце права на гэту кампенсацыю, то звяртайцеся ў вышэйстаячую арганізацыю ці ў прафсаюзныя органы. Толькі рабіць гэта ўсё трэба аператыўна.

***«Я студэнт платнай формы навучання. У тым выпадку, калі я папрашу камісію па размеркаванні, каб мне прадаставілі першае працоўнае месца на агульных умовах, магу я разлічваць і на такія ж гарантыі, як і студэнт-бюджэтнік?»***

— У адпаведнасці з **Палажэннем аб размеркаванні** выпускнікі, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю на ўмовах аплаты па асабістым жаданні могуць накіроўвацца на працу на месцы, якія засталіся пасля размеркавання выпускнікоў-бюджэтнікаў. Заўважце, накіроўвацца, а не размяркоўвацца. Гэта розныя тэрміны. На выпускнікоў у гэтым выпадку не распаўсюджваецца заканадаўства па маладых спецыялістах: іх могуць прыняць на працу па тэрміновым працоўным дагаворы ці на меншы тэрмін, чым два гады, на грашовую дапамогу, якая гарантавана ўсім астатнім, яны таксама могуць забыцца... Але наймальнік мае права любую гарантыю прадаставіць у выглядзе матэрыяльнай дапамогі. Заканадаўства гэтага рабіць не забараняе.

**Надзея ДРЫЛА.**

Захапленне

# СПОРТ НЕ ДЛЯ СЛАБАХАРАКТАРНЫХ

**Віртуозныя скачкі на скейце праз лесвіцы, бардзюры і ўсялякія перашкоды больш нагадваюць эпізод з амерыканскай кінастужкі. У нашай краіне скейтбордынг становіцца вельмі папулярным відам спорту, і з кожным годам колькасць яго прыхільнікаў павялічваецца. Каб навучыцца трывала стаяць на скейце, патрэбна не толькі жаданне. Занятак гэты не для слабахарактарных асобаў, бо драпіны і ссадзіны — нязменныя спадарожнікі пачынаючых скейтбардыстаў. Падрабязней пра заняткі скейтбордынгам і пра цяжкасці, з якімі, магчыма, давядзецца сутыкнуцца, раскажа скейтбардыст Віталій Дабрыян.**

***— Віталік, раскажы, калі ласка, як ты даведаўся пра гэты від спорту?***

— Два гады таму адпачываў у Расіі. Там пазнаёміўся з хлопцамі, якія займаліся скейтбордынгам. Зацікавіўся так, што паспрабаваў сам. А потым ужо проста не змог спыніцца. Спачатку атрымлівалася не вельмі добра, але цяпер прагрэс ёсць.

***— Напэўна, цяжка знайсці месца для такіх экстрэмальных заняткаў. Дзе ты часцей за ўсё катаешся?***

— Сапраўды, такая праблема існуе. На Нямізе ёсць спецыяльна абсталяванае для гэтага месца, але мне не вельмі там падабаецца. Часцей за ўсё, я катаюся ў сваім раёне, і там, дзе больш зручна рабіць скачкі. Такіх месцаў шмат насамрэч, вось толькі людзі негатыўна ставяцца да маіх заняткаў. Ну, вядома, шумна гэта, ды і нельга ў пэўных месцах. Не ўсім падабаецца, калі па лесвіцах катаешся (*усміхаецца*).

***— Для цябе скейтбордынг — гэта спорт ці хобі?***

— Напэўна, для мяне скейтбордынг — асобны від спорту са сваімі правіламі. Але гэта яшчэ і маё хобі, значная частка жыцця. Пры першай жа магчымасці я хапаю скейт і бягу трэніравацца.

***— Што датычыцца трэніровак. Якія самы складаны трук ты выканаў?***

— Я вучуся сам, на сваіх памылках. Таму нейкія складаныя рэчы, вядома, выканаць цяжка. У мяне не атрымаўся «фліп360», скейтбардысты яшчэ называюць яго «троечка». Гэта калі на скейце паварочваешся вакол сябе на 360 градусаў. Гэтым вынікам я задаволены.

***— Ці праводзяцца сярод скейтбардыстаў нейкія спаборніцтвы, або вы катаецеся выключна «для сябе»?***

— Зразумела, спаборніцтвы праводзяцца. Афіцыйныя, з журы, прызамі, і дастатковай колькасцю чалавек (каля трыццаці) — разоў пяць на год. Я паспрабаваў аднойчы ўдзельнічаць, але не вельмі добра атрымалася. Так што пакуль трэніруюся. Яшчэ ёсць неафіцыйныя чэмпіянаты. Гэта калі збіраецца чалавек 15, дамаўляюцца пра месца сустрэчы, і катаюцца «на інтарэс», паказваюць, што могуць.

***— Раскажы пра фінансавы бок скейтбордынгу. Гэта дарагое хобі?***

— Шчыра кажучы, так. Усё залежыць ад якасці скейта. Можна купіць танную дошку, але яна зломіцца праз тыдзень. Гэта мая сёмая дошка, і ў сярэднім яна абышлася мне ў 230 долараў. Але гэта яшчэ не вельмі шмат, якасныя дошкі могуць каштаваць значна даражэй.

***— А ці ёсць у цябе нейкае спецыяльнае адзенне для катання?***

— Галоўнае для мяне — гэта добры абутак, красоўкі з плоскай падэшвай. Усё астатняе павінна быць зручным.

***— Што ты парэкамендуеш хлопцам, якія першы раз становяцца на скейтборд?***

— Напэўна — не баяцца. Упаў — падняўся. Будзеш асцярожным у наступны раз. Больш упэўненасці, што ўсё атрымаецца. І, безумоўна, патрэбна вялікае жаданне. Скейтбордынг гэтага заслугоўвае.

**Таццяна КАВАЛЁВА.**



**Скейтбордынг** як від спорту ўзнік у Каліфорніі, ЗША, напрыканцы 50-х гадоў XX стагоддзя. Ён быў прыдуманы каліфарнійскімі серфінгістамі як сухапутны аналаг сёрфінгу. Першыя спаборніцтвы з прызамі па скейтбордынгу адбыліся ў 1981 годзе. А ў сярэдзіне 80-х з'явілася і спецыяльнае адзенне для скейтбардзістаў: свабодныя штаны, майка і дутыя кеды. Зараз скейтбордынг дзеліцца на некалькі відаў:

**Верт** — катанне у пайпе (спецыяльны спуск прыкладна ад 4 метраў і вышэй)

**Стрыт** — (англ. Street — вуліца) — вулічнае катанне цераз лесвіцы, лаўкі і г.д.

**Катанне ў міні-рампе** — прыкладна тое ж, што і пайп, але вышыня тут дасягае 2,5 метра.

**Пул скейтынг** — катанне ў басейне.

Выпрабавана на сабе

# ЦІ ЛЁГКА ПРАЦАВАЦЬ ІНТЭРВ'ЮЕРАМ?

**Наш карэспандэнт асвойваў новую для сябе прафесію — інтэрв'юера. Вось што з гэтага атрымалася.**

## Хто такі інтэрв'юер?

У падземных пераходах і на вуліцы да мяне пастаянна падыходзілі нейкія людзі і нешта пыталіся. Часта маладыя дзяўчаты прасілі адказаць на некалькі пытанняў. А я заўсёды некуды спяшаўся, што не мог спыніцца, каб даць некалькі адказаў. Навошта гэтыя людзі прыстаюць са сваімі пытаннямі? Для мяне гэта здавалася вельмі дзіўным. Гэта ўжо крыху пазней я зразумеў, што для некаторых гэта — праца.

Інтэрв'юер праводзіць апытанні на вуліцах, у крамах, заходзяць нават у кватэры за вызначанымі пытаннямі. Тэмы анкет абсалютна разнастайныя. Апытанне можа быць на тэму папулярнай маркі піва або асартыменту кандытарскіх вырабаў. Вядома, супрацоўнік павінен быць вельмі камунікабельным. Бо даводзіцца весці дыялог з вялікай колькасцю людзей. Ад умення наладжваць зносіны залежыць і яго заробак.

Інтэрв'юер — гэта чалавек, які працуе ў першую чаргу з людзьмі. Таму асноўныя патрабаванні — актыўнасць, камунікабельнасць, уменне выклікаць прыхільнасць да сябе суразмоўцы. Пераканаць чалавека адказаць на вялікую колькасць бескарысных (з яго пункту погляду) пытанняў — гэта, паверце, справа не з лёгкіх. Акрамя таго, інтэрв'юер павінен быць адказным: запаўняць бланкі добрасумленна, без халтуры, здаваць анкеты ў тэрмін. Часам у анкетах бывае да пяцідзесяці пытанняў. І ўявіце, што вам трэба атрымаць пераканаўчы адказ на кожнае з іх.

## Пошук працы

Знайсці працу інтэрв'юера аказалася не вельмі складана. Прапаноў хапае. Праўда, некаторыя з іх не выклікаюць даверу. Прыйшлося крыху пасядзець на сайце, шукаючы прыстойны варыянт.

«Інтэрв'юер. Зарплата ад 500 тысяч. Працоўны вопыт не мае значэння. Вольны графік. Работа ў галіне сацыялагічных даследаванняў, удзел у анкетаваннях спажыўцоў. Запаўненне апытальных лістоў (ад $2), удзел у фокус-групах on-line апытанняў (ад $20 у гадзіну), тэставанне прадукцыі (ад $10). Патрабаванні да кандыдата: сярэдні ўзровень ведання англійскай мовы (як мінімум, базавыя веды), наяўнасць доступу ў інтэрнэт, уменне працаваць з электроннай поштай, самаарганізаванасць, жаданне працаваць. Умовы: праца на сваім камп'ютары ад адной да трох гадзін у дзень. Ад вас чакаем кароткае рэзюмэ».

Не, гэта крыху не тое. Куды мне з маім веданнем англійскай мовы. Вось каб нямецкую... Да таго ж нейкія вельмі строгія патрабаванні. Працягваю пошук.

«Патрабуюцца інтэрв'юеры. Патрабаванні да супрацоўнікаў: камунікабельнасць і адказнасць. У абавязкі ўваходзіць апытанне насельніцтва. Умовы: пасля заканчэння апытання зарплата выплачваецца на працягу двух тыдняў. Аплата залежыць ад колькасці сабраных анкет. Заробак у сярэднім ад 500 тысяч рублёў. Праца ў асноўным на выхадных».

«Чаго-чаго, а камунікабельнасці мне не займаць!» — узрадаваўся я і адправіўся на гутарку з працадаўцам.

## Працаўладкаванне

У гэты ж дзень я пайшоў на гутарку. Офіс кампаніі, які знаходзіўся ў цэнтры горада, пацешыў мяне еўрарамонтам. Я знайшоў патрэбны кабінет, увайшоў, павітаўся. Маркетолаг Наташа выдала анкету. Перад тым як запоўніць анкету, вырашыў агледзецца. У кабінеце сядзелі тры чалавекі. Усе яны прымалі пачаткоўцаў, тых, хто прыйшоў уладкоўвацца на працу. На сталах ляжалі шматлікія паперы. Наталля праверыла пашпартныя даныя, потым пагаварыла са мной. Мяне лёгка прынялі на работу інтэрв'юерам. На першы погляд здавалася, што гэта вельмі простая работа, але...

## Праца з людзьмі

Зразумела, што мне не даверылі адразу ж пайсці праводзіць апытанне. Спачатку трэба было прайсці «падрыхтоўчыя» курсы. Спецыяльна для гэтага мяне накіравалі да вопытнага інтэрв'юера Алега. Хлопец ужо не першы год праводзіць апытанне, ведае ўсе падводныя камяні.

— Ведаеш, у нашай рабоце самае галоўнае — гэта нікога і нічога не баяцца. Безумоўна, спачатку бывае складана пераадолець у сабе страх падысці да незнаёмага табе чалавека і нешта ў яго спытаць. Але калі ты гэта зробіш, то ўжо няма чаго баяцца, — дзеліцца са мной вопытам Алег.

Я ўсё ўважліва слухаў, але не мог зразумець сэнс усяго сказанага. Мне здавалася ўсё такім лёгкім і простым, што мяне перапаўняла жаданне самому пайсці ў першы ж дзень праводзіць апытанне. Але мне не дазволілі... І правільна зрабілі.

Мы з Алегам атрымалі заданне — правесці апытанне для адной фірмы, якая выробляе мінеральную ваду. Фірма на нашым рынку пачала працаваць нядаўна, таму ёй вельмі важна ведаць перавагі спажыўцоў, каб распрацаваць правільны маркетынг-план. Што ад нас з Алегам патрабавалася зрабіць? Нам трэба было правесці апытанне спажыўцоў, якія ўжо куплялі гэтую ваду. Але тут не ўсё так проста. Справа ў тым, што ў анкеце было дзесьці пяцьдзесят пытанняў. Праводзіць апытанне на вуліцы было проста бессэнсоўна. Таму трэба было рабіць крыху інакш. У такіх выпадках трэба хадзіць па кватэрах. А для гэтага спачатку трэба зрабіць усё магчымае і немагчымае, каб жыхары адчынілі дзверы незнаёмым людзям. І не проста адчынілі, але і адказалі на пытанні, якіх дастаткова шмат.

У Алега ёсць свой маршрут, па якім мы і пайшлі. Аказваецца, горад умоўна падзелены на «тэрыторыі». Гэта зроблена для таго, каб у адзін і той жа дом не прыходзілі інтэрв'юеры з адной і той жа анкетай. Двойчы аднаму жыхару нельга адказваць на тыя ж самыя пытанні.

І вось нам адчыняюць дзверы першай кватэры. Да нас выходзіць дзяўчына-падлетак. Аказваецца, што яна дома адна, больш нікога няма. Не падыходзіць, бо на пытанні анкеты могуць адказваць толькі поўнагадовыя. У другой кватэры ўвогуле ніхто не адчыніў дзверы. І так паўтаралася яшчэ некалькі разоў.

— Разумееш, зараз лета, час адпачынку. Нехта паехаў на мора, а нехта сядзіць на дачы за горадам. У гэтым і заключаецца складанасць. А ў нас аплата залежыць ад аб'ёму выкананай работы, — тлумачыць мне Алег.

Прызнацца, у гэты дзень мы не выканалі неабходнага аб'ёму працы. А назаўтра я ўжо сам пайшоў праводзіць апытанне.

## Як я праводзіў апытанне

Я не мог нават і падумаць, што працаваць інтэрв'юерам вельмі складана. Пяць тысяч рублёў за адзін апытальны ліст... Проста выдатна! Не, гэта не так. Выбачайце, а колькі для гэтага трэба зрабіць працы? Па-першае, колькі неабходна прыкласці намаганняў, каб хто-небудзь згадзіўся адказваць на твае пытанні. Па-другое, колькі трэба часу, каб запоўніць анкету. Добра, калі ў ёй будзе пытанняў пяцьдзесят. А калі і ўсе сто? Менавіта таму гэтая работа і зарыентаваная на студэнтаў. Які разумны чалавек пойдзе працаваць інтэрв'юерам? Правільна, калі толькі карэспандэнт «ЧЗ». Для эксперыменту.

І вось што ў мяне атрымалася. Пратрымаўся я толькі тры дні. На большае мяне не хапіла. Выбачайце, калі ты не выконваеш неабходнага аб'ёму работы, то навошта тады ўвогуле працаваць. Так атрымалася і са мной. Не, я стараўся, прыкладаў усе намаганні, каб цалкам выканаць работу. Але не атрымалася. Не для мяне гэта хадзіць па кватэрах і прасіць людзей адказаць на некалькі пытанняў. Уявіце сітуацыю... Званок у кватэру. Вы выходзіце, а тут стаіць незнаёмы чалавек. Што рабіць? Згадзіцца адказваць на пытанні? А дзе ўпэўненасць, што гэта не злодзей. Я і сам не ўпусціў бы незнаёмага чалавека ў сваю кватэру. Таму я добра разумеў тых людзей, якія адмаўляліся адказваць на пытанні. А прыставаць да людзей не было ніякага жадання. Вынік — за тры дні я запоўніў толькі дваццаць анкет. Гэта вельмі мала. Таму ж я крыху «схітрыў». З гэтых дваццаці анкет дзесьці палову запоўнілі мае знаёмыя. Дакладней, я запоўніў, нават не сустракаўся з імі. Як аказалася потым, так робяць многія. Інакш проста немагчыма выканаць план.

Мне прапаноўвалі потым праводзіць апытанне на вуліцы, калі не падабаецца хадзіць па кватэрах. Але мне ўжо і без таго хапіла. Лепш я пасяджу ў рэдакцыі і напішу матэрыял.

Трэба сказаць, што цякучасць кадраў вельмі вялікая, калі гаварыць пра інтэрв'юераў. Большасць ахвотнікаў працаваць — гэта студэнты. І гэта зразумела, бо зараз лета, шмат вольнага часу.

## Перавагі і недахопы прафесіі

Вы навучыцеся мець зносіны з людзьмі ў самых розных сітуацыях, а таксама пераконваць, бо ад гэтага залежыць ваш заробак. Трэба ўмець падтрымліваць размову на любую тэму. Бо не падыдзеце вы да жанчыны, якая стаіць на прыпынку, і адразу ж пачняце гаварыць пра тую ж мінеральную ваду. Трэба ўсё рабіць паступова, падыходзіць здалёк, зацікавіць чалавека адказаць вам. Пры гэтым неабходна зрабіць такі выраз твару, каб вам не змаглі адмовіць. На выкананне задання даецца некалькі дзён.

Часам можна справіцца і за пару гадзін. Але бываюць такія заданні, што вы можаце і не паспець своечасова выканаць усё. У такім выпадку не атрымаеце ўзнагароду.

Складанасці могуць узнікаць і там, калі вы дрэнна ведаеце горад, з цяжкасцю арыентуецеся ў вуліцах. Да таго ж рэспандэнты вельмі непрадказальныя. Трапляюцца і вельмі ветлівыя суразмоўцы, якія распавядаюць аб усім, што вас цікавіць. Але бываюць і такія людзі, з якімі проста не хочацца размаўляць пасля таго, як яны адкажуць толькі на першае пытанне. Яшчэ не вельмі «ўпрыгожвае» гэтую працу і тое, што пастаянна даводзіцца хадзіць пешшу. Да канца працоўнага дня вельмі моцна стамляюцца ногі і... язык.

## Кантроль за выкананнем працы

Самае цікавае, што працу інтэрв'юераў правяраюць. Але калі да вас доўгі час не будзе ўзнікаць пытанняў, то гэтыя праверкі стануць рэдкімі. Праверка праходзіць у некалькі этапаў. Звычайна першы кантроль работы інтэрв'юераў здзяйсняецца ў офісах перад адпраўкай анкет. У гэтым выпадку праводзіцца праверка на запаўняльнасць анкет, складаецца статыстыка дасягненняў, адмоў ад інтэрв'ю і г.д. Затым праводзіцца кантроль якасці працы інтэрв'юераў менеджарамі кампаніі.

У выпадку выяўлення прамых фальсіфікацый (якія рэдка, але ўсё ж бываюць) прамой праверцы падлягаюць усе інтэрв'ю дадзенага інтэрв'юера. Фальсіфікаваныя анкеты адбракоўваюцца. Замест іх праводзяцца іншыя інтэрв'ю, адпаведныя маршруту і квотам. У выпадках узнікнення іншых парушэнняў да інтэрв'юераў прымыняюцца адпаведныя санкцыі.

## Высновы

Прызнаюся, што часам вельмі складана было праводзіць апытанне. Мала хто згаджаўся адказваць на пытанні, многія казалі, што я не выклікаю ў іх даверу. Я заўважыў, што ўсе людзі пастаянна кудысьці спяшаюцца, у іх няма часу, каб спыніцца і адказваць на пытанні.

Вядома ж, калі ў вас бязвыхадная сітуацыя і вам тэрмінова патрэбныя грошы, то любы спосаб падзаробку задаволіць. Мяне ж хапіла толькі на дваццаць анкет. Не, сорак долараў я не атрымаў за работу. Працадаўцы знайшлі шмат памылак (на іх погляд) і зрабілі ўсё магчымае, каб мне ўвогуле нічога не заплаціць. А я і не вельмі настойваў, што вельмі іх здзівіла. Затое я зразумеў сэнс выказвання, што грошы дастаюцца не заўсёды лёгка... Да такой высновы я прыйшоў, папрацаваўшы інтэрв'юерам. Цяпер ніколі не адмаўляюся адказаць на некалькі пытанняў ветлівым дзяўчатам. Сам працаваў інтэрв'юерам і ведаю, што гэта такое.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# З ДЗЁННІКА ЗВЫЧАЙНАГА СТУДЭНТА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Куплю вось тое піражнае са згушчаным малаком і буду самым шчаслівым і сытым на свеце. Эх, і цукерачак яшчэ тых, грам 150, сёння адпачну, а ўжо заўтра з новымі сіламі за справу...»

А вечарам, калі выпадае вольная хвілінка, студэнт звычайна адчыняе... (не, не кнігу) ноўтбук і глядзіць фільм. Сапраўды, яшчэ цэлых сем дзён!

**ШЭСЦЬ ДЗЁН ДА ЗАЛІКУ**

Свядомасць вяртаецца дзесьці гадзіне а дзевятай зранку. Ты ўжо на лекцыі. Вакол сонныя аднакурснікі. Гудзіць у галаве. А гудзіць у ёй ад фільма жахаў, які ты дагледзеў учора а трэцяй гадзіне ночы.

Дзень праходзіць бы ў тумане. Часам робіцца млосна і страшэнна хочацца спаць. Вялікімі намаганнямі прымушаеш сябе зайсці ў бібліятэку і ўзяць неабходныя дапаможнікі. Але сёння лепш недавучу, чым недасплю...

**ПЯЦЬ ДЗЁН ДА ЗАЛІКУ**

Зранку ўскокваеш звычайна хутка і са злосцю на сябе — праспаў. І як назло — фізкультуру. Несучыся на заняткі, узгадваеш, ці не забыўся ўзяць з сабою ўсе неабходныя рэчы. Здаецца, не.

І тут — кантроль. Дарма даводзіш кантралёру, што твой праязны ляжыць у кашальку, які ты сёння ўсё-такі забыўся ўзяць з сабою...

«Так, — згаджаецца з усім жанчына, дастаючы квітанцыю на штраф. — А ў мяне — верталёт за хатай».

На такіх аптымістычных нотах прыходзіш на факультэт, дзе аднагрупнікі ўжо ва ўсю вывучаюць пытанні да заліку, якія раздрукавала для ўсіх старанная староста.

Сабраўшыся з сіламі, нарэшце і ты бярэш аловак і вялізны спіс з пытаннямі да заліку.

Памятаеце радкі са славутай песні: «Если не сведут с ума римляне и греки, сочинившие тома на библиотеки»? Часам здаецца, што спявалі пра цябе. У такія хвіліны як ніколі згаджаешся са студэнцкімі нараканнямі тыпу, во, пісьменнікі, — панапрыдумляюць, панасачыняюць, панапісваюць, а нам, бедным студэнтам, сядзі цяпер і вучы. Але нічога не зробіш. Вышэйшая адукацыя на дарозе не валяецца. Трэба сядзець і вучыць.

**ЧАТЫРЫ ДНІ ДА ЗАЛІКУ**

Усё пачынаецца з таго, што аднагрупніца прыйшла за канспектам. Адксеракапіраваць, зразумела.

«Васіль мяне зноў кі-і-інуў... — ужо праз дзве хвіліны залiваецца слязьмі дзяўчына. — А я ж яму так верыла-а-а...»

«Спакойна, не трэба плакаць. Усё наладзіцца, — пачынаеш супакойваць гора-закаханую. — Вось убачыш — і дня не пройдзе, як ён патэлефануе. Можа быць...»

«А-а-а...» — яшчэ мацней галосіць дзяўчо.

Выйсце ёсць — гарбата.

«А можа, я мала яму ўвагі ўдзяляла», — зрабіўшы два глыткі індыйскай гарбаты і перажоўваючы кавалак горкага шакаладу, купленага мною на апошнія грошы, з дзіцячай шчырасцю пытаецца аднагрупніца. — Але ж я тэлефанавала яму праз кожныя дзве гадзіны... Ведаю! — раптам з агеньчыкам у вачах пачынае дзяўчо. — Ты ж яго сябар. Пагавары з ім!»

Цяпер зразумела, чаму дзяўчына па канспект прыйшла менавіта да мяне...

**ТРЫ ДНІ ДА ЗАЛІКУ**

Тыц-тыц...Тыц-тыц. Відаць, арганізатары пятнічнай дыскатэкі ў нашым інтэрнаце не зусім у курсе таго, што ў мяне залік у панядзелак. Ды і які вар'ят вучыць прадмет у пятніцу, калі залік толькі ў панядзелак. Правільна, навошта выбівацца з калектыву: у пятніцу — гуляй, на выхадных — чытай... Толькі вось з такімі прынцыпамі і вучыцца неабавязкова.

Аддзяліўшыся ад калектыву, спрабую завесіць вокны шторамі, а шчыліны ў рамах заткнуць анучамі. Гукаізаляцыя, маўляў.

Дарма, сусед па пакоі таксама вырашыў аддзяліцца ад калектыву і паслухаць сваю музыку. Як нялёгка гэта: вучыць пад цяжкую музыку!

**ДВА ДНІ ДА ЗАЛІКУ**

Якое шчасце, што сёння субота. Як ні круці, а дзень крыху вальнейшы за ўсе астатнія. Толькі вось залік ужо паслязаўтра.

Дзень ляціць звычайна хутка. Пакуль усе свае справы ўпарадкуеш, ужо і вечар хутка. Адчуваеш, што прыйшоў самы час узяцца за кнігу. Вось ты выбіраеш патрэбную, разгортваеш і... стук у дзверы. Ой, гэты інтэрнат!

«Можа на хлеб багатыя? Бо ў нас ужо і крошкі няма... — завітаў сябра па паверсе. — Ой, вялікі дзякуй! А можа яшчэ солі вось у гэтую шкляначку адсыплеце? Не забудзем вашу дабрыню, калі што якое — калі ласка. О, а дай мне яшчэ той тазік белы, што ў вас ля халадзільніка стаіць — трэба бялізну памыць. Можа паспею да вечара, бо там матч чэмпіянату Еўропы: Беларусь — Германія...Ну, я пайшоў».

Чэмпіянат Еўропы?! Як жа гэта я забыўся зусім. Які залік — заўтра ж яшчэ цэлы дзень! Вывучу. Хутчэй да суседзяў, у іх жа тэлевізар!!!

**НЯДЗЕЛЯ. ДЗЕНЬ ПЕРАД ЗАЛІКАМ**

Шкада, што ў нашых футбалістаў гульня не пайшла. Нічога, будзем верыць у сонечную будучыню — глядзіш, юніёры падрастуць.

Зранку тэлефануе мама і кажа, што перадасць мяшок з бульбай. Трэба сустрэць аўтобус пасля абеду...

Ужо па дарозе з вакзала, цягнучы з аднапакаёўцам па інтэрнаце цяжкі мяшок з бульбай (мама ў мяне заўсёды шчодрая), сустракаю былога аднакласніка, які таксама вучыцца ў Мінску і з якім не бачыліся чатыры гады. Слова за слова... і прыязджаеш у шэсць вечара.

Нічога. Генеральная вылазка ў прадуктовы магазін, і хутчэй за кнігу — наперадзе яшчэ ноч! Цэлая ноч! Студэнцкі вопыт пацвярджае: у гэту ноч вы можаце з'есці ўсё, што засталося ў «багатым» студэнцкім халадзільніку. Прычым незалежна ад таго, шакаладка гэта ці сала.

**НОЧ ПЕРАД ЗАЛІКАМ**

Сёння лепш недасплю, чым недавучу. Формула поспеху сярэднестатыстычнага школяра. У такія начныя хвіліны па-сапраўднаму зайздросціш сябру-аднапакаёўцу, які мірна пасопвае, абдымаючы мяккую падушку, і бачыць, напэўна, ужо трыццаты сон.

Самае дзіўнае, што час ноччу ляціць імгненна. Не паспееш сесці за хрэстаматыю, ужо і світаць пачынае...

**РАНАК ПЕРАД ЗАЛІКАМ**

Пад раніцу жывот баліць, а галава здаецца дубовай. У ёй поўны абзац — абрыўныя звесткі тыпу: радзіўся, ажаніўся, напісаў і любоўныя трохвугольнікі тыпу Яўхім — Ганна — Васіль.

Студэнцкі аўтобус ранкам: духата, таўпень і кітайцы. Ехаць можна па-рознаму: стоячы на пятках і стоячы на дыбачках; трымаючыся за поручань і трымаючыся за сваю сумку; можна вядома ж, і сесці, калі пашчасціць, але тады давядзецца трымаць процьму сумак, якія згрузяць сябры-аднагрупнікі. Але шчасце на сядзячыя месцы апошнім часам прыходзіць да кітайскіх студэнтаў, таму можна не перажываць.

Пешая дарога ад аўтобуснага прыпынку да корпуса — у кнізе. Мінаем дзверы, «Янка Купала прысвяціў гэты верш сваёй каханай...», лесвіца, «ліра-эпічную творчасць Максіма Танка даследчыкі вызначаюць як неадназначную», а вось і аўдыторыя «Ніл Гілевіч атрымаў званне народнага паэта Беларусі ў ...».

Твая група складаецца таксама з нейкіх нечым закімараных студэнтаў, якія штудзіруюць адзін аднаго... па перыядызацыі творчасці Івана Мележа! Ой, я ж гэта зусім не вучыў. Хутчэй адгортваю патрэбную старонку...

«Добры дзень, дарагія студэнты, — выкладчык ужо ля аўдыторыі. — Як і абяцаў, сёння пішам залік. Спадзяюся, што напішаце добра. Ды і гледзячы на ваш выгляд — вы ўсё добра ведаеце. Дні і ночы мабыць вучылі...»

Каб ён толькі ведаў, як мы гэта рабілі!

* * *

Выходзячы з аўдыторыі, разумею, што рыхтавацца трэба было грунтоўней. У чарговы раз бяру з сябе абяцанне (як і кожны сярэднестатыстычны студэнт), што ў наступны раз я абавязкова ўсё вывучу. Напэўна...

Трэба толькі добра выспацца, каб заўтра фізкультуру не праспаць...

**Ілья ЛАПАТО.**

## За лжывае паведамленне — тры гады турмы

Суд Дубровенкага раёна прыгаварыў «мінёра» за заведама лжывае паведамленне аб выбуху, які рыхтуецца, да трох гадоў і аднаго месяца пазбаўлення волі, паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Віцебскай вобласці.

У красавіку гэтага года ў дзяжурную часць Аршанскага гараддзела ўнутраных спраў паступіў ананімны званок аб замініраванні адміністрацыйнага будынка Аршанскага суда. Для таго каб пазбегнуць выбуху, суду неабходна было толькі перанесці на іншы тэрмін судовае пасяджэнне — такую ўмову паставіў той, хто званіў. На месца здарэння выехалі аператыўныя групы МУС, КДБ, МНС. Наведвальнікі судовай установы былі эвакуяваны. Будынак абследаваны групай размініравання. Выбуховае ўстройства выяўлена не было, а вось «мінёра» ўстанавілі ў той жа дзень. Ім аказаўся раней судзімы 18-гадовы жыхар Оршы. Паведаміць аб замініраванні суда яго прымусіла крыўда на суддзю, які не дапусціў аршанца, які спазніўся, на пасяджэнне, дзе слухалася справа яго сябра.

«Мінёр» павінен таксама кампенсаваць затраты на пакрыццё матэрыяльнага ўрону.

**Дыяна КУРЫЛА, БЕЛТА.**

Тайскія нататкі Алены Барысевіч

# «БЕЛЫЯ» ПАЧЫНАЮЦЬ І ВЫЙГРАЮЦЬ?

**Ёсць у тайскай мове слова, якое проста магічна дзейнічае на тайскіх жанчын. Такія словы ў кожнай мове можна адшукаць. Ну, кшталту, «брыльянт», «гламур», «золата». Аднак у Тайландзе ўсё значна прасцей — «сыкау». Пераклад яшчэ прасцейшы — «белы» (колер).**

Блакітныя альбо зялёныя вочы, валасы колеру «скандынаўскі блонд» ці хоць бы русыя, як у беларускі. І, бадай, самая запаветная мара любой тайскай жанчыны — белая скура. Для таек, скура якіх ад прыроды карычневага колеру, белая скура становіцца амаль недасягальным ідэалам.

Ой, на якія толькі ахвяры ні ідуць тайкі, каб хоць крышачку «пасвятлець»! Дарэчы, шматлікія вытворцы касметычных прэпаратаў на гэтым нядрэнна зарабляюць. Бо варта толькі пазначыць, што крэм валодае эфектам адбельвання — і тайкі за ім гатовыя суткі ў чарзе стаяць.

Каб яшчэ больш не пацямнець на шчодрым тайскім сонейку, тайскія дзяўчаты і жанчыны амаль ніколі не апранаюць кароткія спаднічкі ці кофтачкі з вельмі кароткім рукавом. Яшчэ адзін абавязковы атрыбут сучаснай тайкі — парасонік, які павінен абараніць сваю гаспадыню ад сонечных промняў. Я заўсёды заходжуся ад смеху, калі бачу, як мая сяброўка Пэм — невялічкая, ростам каля 150 см, — упэўнена крочыць па вуліцы, амаль поўнасцю хаваючыся пад агромністым фіялетавым парасонам. Ну не Пэм, а сапраўдны парасонік на ножках! Нарэшце, апошняя зброя тайскіх жанчын, якія хочуць выглядаць крыху бялей, чым насамрэч, — светлая пудра.

Але ж гэта не ўсё! З некаторага часу ў Тайландзе даволі папулярнае малако. Адразу скажу, што малако — абсалютна не тайскі «народны» прадукт. І малочных кароў у Тайландзе няма. Ёсць каровы — рыжыя, вельмі худыя, з доўгімі вушамі, — але малака яны не даюць.

У краіне працуе некалькі фермаў, на якіх вырошчваюць «правільных» еўрапейскіх кароў. Якія і даюць малако, што потым паступае на продаж. Таму шчыра прызнаюся, што цэны на малако мяне адразу здзівілі. Лічыце самі — літр малака каштуе прыкладна 65 бат (каля 2 долараў). Але гэта так, да ведама... Вы б бачылі, што тайцы зрабілі з малаком! Яно часта прадаецца ў невялічкіх упакоўках. З калагенам, алоэ-вера — для жанчын. З цукрам — для дзяцей.

«Малако — гэта вельмі добра! Яно робіць скуру бялейшай», — дзеліцца са мной сваімі жаночымі сакрэтамі сяброўка Чып. О Божа... Адным словам, тайкі робяць усё магчымае і нават немагчымае для атрымання белай скуры.

Таму ўладальніцы белай скуры ў Тайландзе — сапраўдныя зоркі. А калі яшчэ і бландзінка, ды і ўладальніца светлых вачэй — амаль багіня.

Шчыра прызнаюся, што ў Тайландзе час ад часу я адчуваю сябе ніякавата якраз з-за сваёй



«светласці». Ледзь не на кожным кроку да мяне падыходзяць мужчыны, каб сфатаграфавацца. Мае тайскія сяброўкі жартуюць, што трэба браць з тайцаў за гэта плату.

І я дагэтуль успамінаю, як аднойчы падчас наведвання кітайскага храма непадалёк ад горада Патая, дзе я жыву, я прысела адпачыць на лавачку. Ледзь не на дыбачках збоку да мяне падышла дзяўчынка-школьніца. І, мабыць, не ведаючы, на якой мове са мною размаўляць, проста паказала на фотаапарат. Я заўсміхалася, кіўнула і павіталася «Саватды-ка!» («Добры дзень!», па-тайску, на шчасце, я размаўляю). З усіх бакоў мяне акружылі тайскія хлопчыкі і дзяўчаткі. Атрымалася сапраўдная фотасесія на паўгадзіны!

А як тайцы любяць светлых дзяцей! Гэта трэба бачыць! Фатаграфуюцца, падбягаюць, каб дакрануцца. Белая скура — дзівосы ды і толькі! Праўда, белыя дзеці даволі нервова на гэта рэагуюць...

У крамах жа за белаю жанчынаю тайкі гатовыя хадзіць, як прышытыя. Будуць глядзець, што купляеш, што робіш, як ідзеш.

Аднак, прызнаюся, прыемна чуць ледзь не на кожным кроку «Суай» («Прыгожая») ці нават «Суай мак» («Вельмі прыгожая»). Праўда, адкрыю страшную тайну — яшчэ часцей у адрас белых жанчын гучыць зняважлівае «Пумпуй» («Тоўстая»). І што ж ты тут зробіш, калі ў славянак прырода такая. А тайцы гэтага не разумеюць...

Таму застаецца кантраляваць вагу і берагчы сваю шыкоўную белую скуру. І, вядома ж, асляпляльна ўсміхацца ў адказ на тайскае «Суай мак!» Бо, пагадзіцеся, прыемна адчуваць сябе багіняй і прыгажуняй. Хоць бы і на два тыдні ў далёкім Тайландзе.

## У педагагічнага — «Дзень нараджэння»

**Дзень сваёй альма-матэр адзначаць 8 верасня студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.**

Раніцай у БДПУ распачнецца спартыўнае свята, у рамках якога пройдуць фінальная сустрэча Кубка чэмпіянату БДПУ па валейболе, спаборніцтвы па плаванні і таварыская сустрэча зборнай БДПУ і каманды выпускнікоў універсітэта.

Затым адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне Савета ўніверсітэта. У 14 гадзін стартуе канцэртная праграма «Віват, БДПУ!» з удзелам творчых калектываў універсітэта — народнага ансамбля «Рэй», вакальных ансамбляў «Модус» і «Дыямант», а таксама лаўрэатаў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. А вечарам студэнтаў чакае святочная дыскатэка «BSPU DANCE». Ганаровым госцем студэнцкага свята стане Аляксандр Радзькоў, міністр адукацыі нашай краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Муз-news

### «БЕЗ БІЛЕТА» ЗА МЯЖУ? ЛЁГКА

Нядаўна гурт «БЕЗ БІЛЕТА» падпісаў доўгатэрміновы кантракт з расійскай музычнай кампаніяй «М2». Дамоўленасць прадугледжвае прасоўванне песень і кліпаў гурта, а таксама выданне альбомаў у Расіі. У перспектыве таксама і канцэртныя туры па краіне.



«Для нас было важна не проста падпісаць кантракт хоць з кімнебудзь, а знайсці на тэрыторыі Расіі надзейнага партнёра, — сцвярджае лідар гурта Віталь Артыст. — Мы знайшлі аднадумцаў, у нас супадаюць погляды на музыку і яе прасоўванне. Да таго ж мы ўзгаднялі кожную дэталь кантракта, каб ні наша творчая свабода, ні інтарэсы «М2» не пацярпелі».

Пакуль распрацоўваюцца планы і абмяркоўваюцца перспектывы, творчая справа не стаіць на месцы. Песня «БЕЗ БІЛЕТА» «Летуценнікі» ўжо чацвёрты тыдзень запар уваходзіць у дваццатку лепшых «Хіт-парада дзвюх сталіц» на радыё «Максімум».

### IQ48 У ПОШУКАХ НАЗВЫ ДЛЯ АЛЬБОМА

Гурт IQ48, які вярнуўся нядаўна з музычнага фестывалю ў Запарожскім краі, пачаў рыхтавацца да прэзентацыі свайго другога альбома. Але тут высветлілася, што ў пласцінкі, якая будзе гатовая ўжо ў кастрычніку... няма назвы.

Дакладней, паводле слоў гітарыста Яўгена Бузоўскага, музыканты прыдумалі было варыянт «Марсіяне», аднак аказалася, што ў гурта «Братья Грим» ужо ёсць альбом з менавіта такой назвай. Тады IQ48 вырашылі звярнуцца па дапамогу па слухачоў. Галоўная складанасць заключаецца ў тым, што трэк-ліст будучага альбома трымаецца ў сакрэце — вядома толькі, што ў яго трапяць 12 песень, і што ўсе яны неаднаразова гучалі на канцэртах. У якасці бонусаў на дыск будуць запісаныя 4 відэакліпы, у тым ліку і самыя свежыя, на песні «Гэй, наперад!» і «Я звар'яцела».

Пакуль альбом рыхтуецца да выхаду, музыканты прымаюць варыянты яго назвы — на электронную пошту varjaty@gmail.com. Аўтару лепшай ідэі абяцаны ўласна альбом з аўтографамі, два білеты на прэзентацыю і яшчэ нейкі асабісты — сакрэтны, але каштоўны — падарунак...

### «ПЕСНЯРЫ» ПІРАТАМ НЕ ТАВАРЫШЫ

Напрыканцы жніўня расійская гандлёвая фірма «Нікіцін» выдала альбом Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры» — «Распавядальная». У Беларусі гэты дыск выйшаў яшчэ год таму, але ў Расію трапіць толькі цяпер і, як спадзяюцца выдаўцы, стане першым крокам у барацьбе з музычным піратцтвам.

«Песняры» для расійскай аўдыторыі — свайго роду гісторыя, з якой звязаныя прыемныя ўспаміны не аднаго пакалення. Ансамбль помняць і любяць. І мы спадзяёмся, што з выхадам новага альбома на ліцэнзійных носьбітах доля пірацкай прадукцыі з запісамі «Песняроў» панізіцца», — разважае кіраўнік дэпартамента CD фірмы «Нікіцін» Дзмітрый Казлоўцаў.

Кіраўнік ансамбля Віктар Шарапаў расказаў: музыканты даўно ведаюць, што на Гарбушцы продаж пірацкіх дыскаў з запісамі «Песняроў» ідзе поўным ходам. Магчыма таму, што афіцыйныя альбомы калектыву не выдаваліся ў Расіі з 2007 года. Цяпер ансамбль збіраецца выправіць гэту сітуацыю, і перавыдаць таксама іншыя свае альбомы, прапанаваўшы слухачам якасны гук, які прыемна не толькі слухаць, але і мець дома ў калекцыі.

### ПРАКАЦІ НАС, ДЗЯЎЧЫНА, НА «ХАМЕРЫ»...

Дзень усіх закаханых па традыцыі адзначаецца зімой, 14 лютага, але спявачка Улада вырашыла не чакаць так доўга, і прапанавала закаханым парам незвычайную акцыю-конкурс — «Рамантычная прагулка». Пераможцам яе абяцана незабыўная паездка на незвычайным лімузіне — «Хамеры» і падарункавы пакет ад «Святочнага агенцтва Улады».

Акцыя працягваецца з 1 да 5 верасня на «Рускім радыё ў Беларусі». Удзельнікам трэба крыху ўдачы, каб дазваніцца на радыё, і многа смеласці, каб у прамым эфіры на ўсю краіну прызнацца ў каханні. Пяці парам, чые словы прагучаць найбольш шчыра, і дастанецца рамантычная паездка. Акрамя таго, на працягу двух месяцаў спявачка прымае на свой афіцыйны сайт www.wlada.com сцэнарыі «ідэальнага вяселля» і прыгожыя гісторыі кахання. Удзельнікам інтэрнэт-конкурсу таксама падрыхтаваны рамантычны і прыемны прыз. «У сучасным рытме жыцця мы часта забываемся на каханне і рамантыку, — лічыць Улада. — Многія маладыя людзі ўсё менш думаюць аб заключэнні афіцыйнага шлюбу, каб не загразнуць у бытавых праблемах. Але ж кожны дзень можна рабіць сваім каханым невялікія прыемныя сюрпрызы! Спадзяюся, адным з іх і стане наша акцыя».



**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Хто каго?

# «БЕЗ СТА ГРАМ НЕ РАЗБЯРЭШ, ШТО ЗА СІТУАЦЫЯ...»

**«Ну «Звязда»!.. Ну Кляшчук!.. І падловіць жа момант! Гэта ж трэба — такое ўбачыць, такое зняць!» — усклікаюць вось гэтак многія чытачы.**

**Нямногія, на жаль, усклікнуўшы, пачынаюць чухаць патыліцы, маракаваць, самі сабе ўсміхацца, нешта занатоўваць, адкладваць газету ўбок, зноў да яе вяртацца і нешта запісваць. Каб потым, нарэшце, тое, што атрымалася, даслаць у рэдакцыю — вось, маўляў, дзе сабака закапаны, вось у чым сутнасць!**

**Здымаем капялюш, як кажуць, бо ведаем, што яе, гэтую сутнасць, прычыну чаго-небудзь, здараецца, і з сабакам не знойдзеш!**

**Праўда (што таксама, здараецца!), і патрэбна яна бывае... Як пятая нага... Самі ведаеце, каму. Бо варта рот адкрыць, штосьці выдаць — на цябе ўсіх сабак навешаюць (альбо начапляюць)! І ганяй іх потым, або ім жа сена касі. Куры засмяюць!**

**Але ж і маўчаць, таго сабаку з'еўшы... Хіба, вачэй пазычыўшы... У яго ж...**

**Зрэшты, гэта — да слова. Слова пра тое, што подпісаў пад чарговы конкурсны здымак ізноў, што сабак. Прычым напісаны яны зусім не так, як курыца лапай. Хоць заданне, ну згадзіцеся, і досыць цяжкім было.**

*Без ста грам не разбярэш,*
*Што за сітуацыя, —*

усклікнуў адразу ж спадар Барысёнак з Ушаччыны. Але ж потым, мусіць, недзе знайшоў іх, выпіў і, лічы, адразу ж выдаў:

*...Ці вялікая любоў,*
*А ці акупацыя?*

Можа быць, сцвярджае Любоў Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна, і тое, і другое:

*Тут, у будцы, у двярэ*
*Гаспадарыць госця.*
*Нехта сілаю бярэ*
*І нахабствам хтосьці.*

Яно, гэтае нахабства, як вы чулі, ці не другое шчасце цяпер. Таму многія ідуць ва ўсе цяжкія, а ўжо хітруюць...

*Курку ў жонкі ўзяў сабака —*
*Страціў будку небарака.*
*Яго жонка, далібог,*
*Не пускае на парог...*
*Не сакрэт, што дзе-нідзе*
*Так бывае і ў людзей:*
*Выйшла дзеўка за старога —*
*І старога прэч з парога, —*

з веданнем справы пішуць сужэнцы Астроўскія з Мінска. Данута Фларыянаўна Фетчанка з вёскі Ізбішча, што на Лагойшчыне, упэўнена, што так яму, дурню старому, і трэба:

*Заключыў няроўны шлюб, —*
*Сам сабе цяпер не люб...*
*А жаніўся бы на Жучцы,*
*Жыў бы панам... І ў будцы.*

Каб жа ён ведаў, што гэтак будзе! Ён жа на лепшае спадзяваўся, ён, можна сказаць, старэйшых слухаўся. Адзін з якіх (Міхаіл Паўлавіч Дубовік, з вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна) раіў — усім:

*Калі раптам, неспадзеўку*
*Да цябе заблудзіць дзеўка —*
*На пяшчоту не скупіся,*
*Ўсім, што маеш, падзяліся!*

Падзяліўся... Цяпер жыві, як хочаш. А вось як?

Хто пра гэта не думаў, хто не варажыў, хто не хацеў, хоць адным вочкам, зазірнуць у тое, што будзе. Альбо ёсць... Дзе? А хоць бы і па суседстве. Уладзімір Сітнік з вёскі Палажэвічы Старадарожскага раёна мяркуе, што менавіта цікаўнасць прывяла курыцу ў сабачую будку. Праз хвільку выходзячы адтуль, яна і «кажа» ўсім:

*— Ко-ко-ко, мае вы людцы,*
*Зразумець цяпер магу,*
*Як жывецца Бобу ў будцы,*
*Ды яшчэ й на ланцугу.*

Ну з ланцугом, усё зразумела: няволя ёсць няволя. Што яна дрэннага ў сабачым жытле знайшла, ведае спадар Васільеў з пасёлка Сасновы Асіповіцкага раёна, бо гнеўныя «рэвізорчыны» думкі падслухаў:

*Развёў у будцы мух і блох,*
*Гразі — не вынесці і ўтрох...*
*Не можаш жыць у чысціні,*
*Тады жытло выслабані!*

Вы думаеце, сабаку гэты «прыгавор» збянтэжыў? Не, ён з іншым змірыцца не можа. З чым? Ды з відавочным!

*Глядзіце — кура кантралёр!..*
*Куратнік вымела б, свой двор,*
*З шаста ўсё лішняе зграбла,*
*А потым — правяраць ішла.*

Так мо хоць нейкі перапынак быў бы, а тое:

*Што — праверка? Зноў праверка?*
*На наяўнасць блох і мух?..*
*А ці ўсе з сабой паперкі?*
*Бо інакш — пад неба пух*
*Узляціць, бы ўвосень лісце,*
*Калі вецер зараве.*
*...Шмат праверак, а карысці*
*Не прыносяць яны мне, —*

сцвярджае за гаспадара «кватэры» той жа спадар Сітнік са Старадарожчыны, бо накіпела, як кажуць. А галоўнае — не зразумела:

*За што, скажыце, столькі мук?*
*Хоць не выходзь ты з хаты:*
*З рэвізіяй то жаба-жук,*
*То певень разяваты.*

Вось і жыві, вось і выконвай свой сабачы абавязак. А як?



*Гаспадар мне загадаў,*
*Каб двор-хату пільнаваў.*
*Не сказаў ён ані слова,*
*Ці браць курку пад ахову?*

— за «малодшага брата» клапоціцца Мікалай Страрых з Гомеля, бо ці мала што: спачатку не папярэдзілі, а потым праверацъ ды яшчэ, свят-свят-свят:

*Была хатка твая,*
*Цяпер стала мая,*
*А захочаш пажыць, —*
*Заплаці... Удвая.*

Каб што лепшае — такі ўльтыматум (паводле меркавання спадарыні Чыгрынавай) можа выставіць гэта кантралёрка. Калі, зразумела ж, ёй гэта жытло «абломіцца». Нейкім чынам... Бо пра яго ж цяпер самім клапаціцца трэба:

*Курка кут купіць хацела,*
*Ў банк дурніца заляцела*
*Той адразу ж даў крэдыт —*
*Абабраў, як той бандыт, —*

піша пра бедную Ала Тарасік з Мінска. І ўжо прозай дадае, што пра свой кут у куратніку курка цяпер не марыць, яна яго ў будцы шукае.

Што з героямі здымка яшчэ магло здарыцца? Арыгінальная прапанова ў спадарыні Фетчанкі з Лагойшчыны:

*Каб мець грошы на раскрутку,*
*У арэнду Бос здаў будку.*
*А калі й ланцуг парве,*
*Свет не чуў, як запяе!*

Што яшчэ трэба, каб яму запець? Ну зразумела ж! Сабака гэты (паводле меркавання спадара Дубовіка з Бярэзіншчыны) цяпер кажа курыцы:

*Калі ты харч які шукаеш,*
*Тады ты розуму не маеш,*
*Бо гаспадыня ў нас такая,*
*Што мне й самому не хапае.*

А ўсё чаму?

*Загуляла баба Томка,*
*Як гавораць, ну на нет.*
*Засталіся на падворку*
*Курка Раба ды Валет, —*

канстатуе Зоя Пятроўна Янучок з вёскі Нагорнае Клецкага раёна. —

*Эканамічны крызіс*
*Завітаў у двор:*
*Туляцца ля ганку*
*Курка ды Трэзор.*

Ёсць, дарэчы, меркаванне (у мінчан Астроўскіх), што ў саюзе гэтым дзіўнага анічога няма:

*Вельмі дружнай выйшла пара*
*Ў куркі Рабы і Мухтара —*
*Ён вартуе пакрысе,*
*Яна яйкі ўсім нясе.*

А галоўнае —

*Калі й слабая курыца*
*Ды сабакі не баіцца,*
*Калі згода ў двары, —*
*Тут жывуць Гаспадары!*

Клічнік — наш. Яшчэ чатыры радкі — ад спадара Колесня з Беразіно:

*Жыхары падворка вучаць*
*Нас, людзей, як трэба жыць:*
*Злом — нутро сваё не мучыць,*
*А з дабром — заўжды дружыць.*

Гэта значыць (вяртаючыся да таго, з чаго пачалі), крый божухна не сварыцца, не лаяцца (а тым больш — брыдка, каб па сабаку з рота скакала), ніколі не адчуваць сябе ў ролі яго, пабітага, альбо мокрай курыцы, нічога не траціць, як герой Шукшына: помніце — 25 рублёў у трубачку і сабаку пад хвост?), не класціся спаць з курамі, а працаваць. І мець за гэта грошай столькі, каб... Ну вы ведаеце.

Не ведаеце, хто выйшаў пераможцам конкурса на папярэднім этапе? То нагадаем, што на здымку тым былі тры амаль голыя мужыкі ў дзвярах лазні і скажам, што паводле меркавання вялікага чытацкага журы лепшыя радкі пра іх склалі сужэнцы Астроўскія з Мінска, Валянціна Апанасаўна Гудачкова з Жыткавічаў, Алег Раманоўскі з Івянца і Міхаіл Паўлавіч Дубовік, з чым, крыху паспрачаўшыся, пагадзілася і маленькае рэдакцыйнае журы. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету накіроўваецца ў вёску Арэшкавічы, што на Бярэзіншчыне. Хочаце, каб да вас? Далучайцеся! Шанцы ёсць. Здымак — таксама.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



Ёсць праблема!

# КАМУ ПАТРЭБНА ІПАТЭРАПІЯ?

**Вось ужо другі год да Валянціны Вінаградавай — старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання верхавой язды і іпатэрапіі (БГАВЯІ) — не могуць патрапіць на заняткі па іпатэрапіі дзеці з абласцей і раёнаў Беларусі. Камусьці вымушаны адмаўляць з-за перагрузу коней. Камусьці — з-за недахопу часу. Многім — з-за цяжкасці дыягназаў, у рабоце з якімі патрэбна наймаць спецыялістаў. Прычынаў шмат, але ўсе іх можна аб'яднаць у адну — недахоп грошай.**

Іпатэрапія *(ад. грэч. hippos — конь)* — фізіятэрапеўтычнае лячэнне, пры якім выкарыстоўваецца конь і верхавая язда. Сутнасць метаду ў тым, што пры верхавой яздзе конь перадае рухальныя імпульсы, аналагічныя руху чалавека пры хадзе (ад 90 да 110 рознанакіраваных імпульсаў у хвіліну). Такім чынам хворы атрымлівае аналагічную хадзе нагрузку, і яго мышцы развіваюцца. А таксама пры кантакце з канём паляпшаецца псіхічны стан хворага.

Паводле слоў Рыгора Шанько, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, загадчыка кафедры дзіцячай неўралогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, іпатэрапія станоўча ўплывае на фізічны і псіхалагічны стан хворага.

— Іпатэрапія — гэта і масаж, і лячэбная фізкультура. Рухі каня перадаюцца мышцам хворага і прымушаюць іх працаваць. Верхавая язда паказана пацыентам з парушэннямі апорна-рухальнага апарата, неўралагічнымі парушэннямі рознай ступені цяжкасці. Гэта і затрымкі псіхічнага развіцця, аўтызм, поліміэліт, рассеяны склероз, эпілепсія пры рэдкіх прыпадках, парушэнне асанкі, скаліёз 1-й і 2-й ступені, ДЦП, неўрозы, астэахандрозы, гіпертанічная хвароба 1-й і 2-й стадыі, нестабільнасць пазваночна-рухальнага слупа, грыжы, згуба зроку ці слыху і г.д., — распавядае Рыгор Рыгоравіч. — Але тут яшчэ іншы аспект — псіхалагічны. Звычайна хворы знаходзіцца пастаянна ў ложку, то што ён бачыць? Толькі рэчы вакол сябе, столь і г.д. Часам ён трапляе на вуліцу, але там, як і дома, ён залежны ад бацькоў, ад тых, хто за ім глядзіць. І вось, калі хворы сядае на каня, то бачыць новы свет зверху. Праз пару заняткаў пацыент пачынае кіраваць канём. Цяпер не ён залежыць ад каня, а конь падпарадкоўваецца яму. Псіхічны стан хворага такім чынам паляпшаецца. У яго знікае апатыя, з'яўляецца адчуванне сваёй значнасці, што вельмі важна, праяўляецца цікавасць да наваколля, ды і іншыя метады лячэння ўспрымаюцца нашмат лепш.

Проціпаказанні існуюць для людзей з рэзка парушанай псіхікай. У маёй практыцы быў такі прыклад. Дзяўчына пакутавала на эпілепсію. Яе завезлі пакатацца на кані. Ёй вельмі спадабалася. Пасля гэтага кожны дзень гучалі просьбы «катацца, катацца». Але кожны дзень гэта рабіць было немагчыма. І яе псіхічны стан стаў пагаршацца.

Проціпаказанні да заняткаў існуюць і пры сардэчна-сасудзістых захворваннях. Пры арытміях, стойкіх экстрасістолах нельга саджаць на каня, таму што могуць быць пагаршэнні стану здароўя да страты прытомнасці, поўная блакада 4-й ступені, скаліёз 3—4-й ступені, вывіхі, падвывіхі, нестабільнасць тазасцегневых суставаў, парушэнні інтэлекту (некіруемыя парушэнні), гіпертанічная хвароба 3-й ступені (пры верхавой яздзе магчымы ўнутраныя кровазліцці).

Заняткі іпатэрапіяй праходзяць у пасёлку Калодзішчы, што пад Мінскам. Дзяцей возяць седзячы альбо лежачы па 30 хвілін па лесе. Інструктару дапамагаюць бацькі. У сярэднім курс цягнецца тры месяцы. Эфект ад заняткаў у кожнага свой. Але паляпшэнне назіраецца ва ўсіх, у некага хутчэй, у некага больш павольна.

— Сюды ходзім вось ужо два гады, — расказвае маці трохгадовай Алачкі. — Нам параіў неўрапатолаг. Алачка вельмі любіць коней, яна іх ведае ўсіх. Была ў нас Дусечка любіміца, а зараз памерла. Віко ёй падабаецца, на Завеце больш складана, таму што ён даволі «шырокі». Дапамагае, я вам скажу. Вельмі добра мышцы ўмацоўваюцца, паляпшэнні эмацыйныя. Пасля кожнага занятку дзіця супакойваецца. У нас развіваецца цікаўнасць. Ды і фізічныя нагрузкі такога плана не замяніць ні трэнажор, ні практыкаванні. Хоць раз прапусціш і вельмі адчуваецца.

Але ўсім ахвотнікам дапамагчы тут не ў стане. У адным толькі Мінску хворых на ДЦП — 551 чалавек. Па Беларусі 3795 дзяцей пакутуюць на гэтую хваробу.

— У нас кабыла Дусечка нядаўна памерла, таму я ўразаю групу: Віко хворы, а Цёма нявопытны яшчэ.

За тыдзень 20 дзяцей наведваюць заняткі па іпатэрапіі. Асноўны дыягназ — дзіцячы цэрэбральны параліч. Для заняткаў з дзецьмі па іншых захворваннях патрэбны спецыялісты. Напрыклад, для работы з дзецьмі, хворымі на шызафрэнію ці аўтызм, абавязковы псіхолаг. Яго зараз у аб'яднанні няма.

— У адпаведнасці з праектам «Падкова на шчасце», які мы разам з дзіцячым хрысціянскім фондам наладжвалі, на псіхолага разлічылі заработную плату — 150 000 у месяц, — расказвае Валянціна Вінаградава. — За такія грошы ніхто ісці на працу не хоча.

Зараз Валянціна займаецца ў асноўным гаспадарчымі пытаннямі. На распрацоўку новых методык часу, па яе словах, не хапае. Калі мы сустрэліся, яна актыўна шукала грошы, для таго, каб прывезці гарбузы для коней. Дзе знайсці корм, лекі, ветэрынараў, валанцёраў, якія змаглі б дагледзець коней — пытанні кожнага дня. Праблемы ёсць і з канюшняй.

Арэнда ўчастка — $300. Канюшня — недабудаваны гараж. Зімой тут сыра і холадна. Першапачаткова арэндавалі ўчастак на паўгода. Але вось ужо чацвёрты год працягваецца арэнда. Гаспадару гэта не падабаецца. Я шукала ўчастак недалёка ад лесу, каб было дзе ездзіць, і ад прыпынку гарадскога транспарту, дык нідзе не знайшла месца для трох коней. На два яшчэ згаджаюцца, а на тры — ніяк, — распавядае Валянціна.

— Было б нядрэнна, калі б улады нам дапамаглі хоць бы з канюшняй, — кажа Вольга, валанцёр-інструктар. — На корм мы ўжо неяк самі зарабілі б.

— Але тут свае цяжкасці, — уздыхае Валянціна. — Каб пачаць фінансаванне іпатэрапіі, патрэбна ўнесці яе ў дзяржаўны рэестр рэабілітацыйных методык, якія прымяняюцца ў Беларусі. А каб яе ўнесці ў дзяржаўны рэестр (вось тут і пачынаецца замкнутае кола), трэба, каб беларускія навукоўцы правялі даследаванні і склалі методыкі, як працаваць з дзецьмі, якімі курсамі, якія практыкаванні рабіць і г.д. Узяць польскую ці расійскую методыку, якая ўжо працуе не адзін дзесятак гадоў, яны не могуць. Гэта ж як лозунг: «Купляйце беларускае». А на беларускае грошай няма.

Адзін занятак іпатэрапіяй (30 хвілін) каштуе 12 000 рублёў. За 20 чалавек штотыднёва БГАВЯІ атрымлівае 240 000, за месяц — 960 000 (прыкладна $450). За гэтыя грошы атрымліваецца аплаціць арэнду і купіць крыху корму. Для параўнання: выдаткі на ўтрыманне трох коней (корм, лекі, ветэрынар) складаюць $800—1000.

— А кошты на заняткі я павысіць не магу, таму што толькі павысіш — гэта будуць ужо не членскія ўзносы. Зацікавіцца падатковая інспекцыя. Занятак стане гаспадарчай дзейнасцю — і палову заробленага будзем аддаваць на падаткі. Вядома, можна было б зарабляць пракатам коней. Але яны і так хворыя, які там пракат. Віко — інвалід, у яго баліць спіна. Мы яго ўсім светам выкуплялі. Зёва — немалады ўжо даволі. Застаецца толькі трохгадовы Цёма. Дык адзін Цёма шмат не выцягне.

— Колькі мы лістоў пісалі, колькі прасілі. Летась абяцаў мне адзін чыноўнік месца ў будучым коннаспартыўным комплексе. Толькі заяву, кажа, напішы. Я і напісала. Але мінуў верасень, кастрычнік, лістапад — канюшні няма. Снежань — глуха. А перад самым новым годам, калі я яму патэлефанавала, ён мне сказаў, што, маўляў, мы будуем базу алімпійскага рэзерву, а ты са сваёй іпатэрапіяй пад нагамі блытаешся. Мясцовая агародніння база давала нам будынак, а дакладней, каробку чатырохсценную, але ўдакладніла, што яе ў любы момант могуць знесці. Няважна, коні там, людзі.

— Так цяжка, як сёлета, не было ніколі, — прызнаецца Валянціна.

***Каментарый Леаніда ЮШКЕВІЧА, першага намесніка старшыні па конна-спартыўным майстэрстве і ўзаемадзеянні з Беларускай федэрацыяй коннага спорту:***

— Комплекс будзе гатовы да канца гэтага года. Мы разглядаем пытанне аб размяшчэнні там коней БГАВЯІ. Але вы павінны зразумець, што гэта напаўлегальна. Не рыхтуюцца спецыялісты, няма методык. Ліцэнзіі таксама не выдаюцца. Іпатэрапія не існуе юрыдычна ў Беларусі. У Расіі, Польшчы, Германіі і Францыі гэта далёка пайшло. У нас усё робіцца на энтузіязме...

**Настасся ЗАНЬКО.**



Спорт-тайм

## Страцілі лёгкаатлетак на два гады

Двухгадовыя дыскваліфікацыі атрымалі штурхальніца ядра Юлія Леанцюк і скакунняя-бар'ерыстка Ірына Баханоўская. Беларускіх лёгкаатлетак абвінавацілі ў выкарыстанні забароненых прэпаратаў на чэрвеньскім Кубку Еўропы ў французскім Анесі. Нагадаем, што днямі адно з інфармацыйных агенцтваў распаўсюдзіла інфармацыю аб магчымай дыскваліфікацыі нашых малатабойцаў, прызёраў Алімпійскіх гульняў Івана Ціхана і Вадзіма Дзевятоўскага. «Ужо трэці дзень мне тэлефануюць з-за нейкіх чутак, — скардзіцца Вадзім. — У Пекіне нас правяралі на выкарыстанне допінгу і пасля спаборніцтваў ніякіх дакументаў не прад'явілі, а тут прайшоў тыдзень пасля завяршэння Алімпіяды, і нехта пачынае нешта выцягваць. Не разумею, каму і для чаго гэта патрэбна? Я перакананы, што нічога забароненага ні ў мяне, ні ў Ціхана быць не павінна».

## Пудышаў не губляе форму



Фота Пятра ФАМІНА.

Прайшлі першыя матчы 1/16 фіналу розыгрышу Кубка Беларусі па футболе. Самым запамінальным выдаўся матч у Паставах. Зноў прыцягнуў да сябе ўвагу 54-гадовы старшы трэнер мінскага МТЗ-РІПА Юрый Пудышаў, які выйшаў на поле, зразумела, не ў стартавым складзе трактаразаводцаў, а на замену — на 67-й хвіліне матча з ПМЦ (першая ліга). Паўабаронца нават узяў удзел у трэцяй галявой атацы мінчан: перамогу святкавалі госці — 3:1. Вынікі іншых сустрэч, якія адбыліся 3 верасня: «Вертыкаль» (Калінкавічы, Д 3) — «Лакаматыў» (Мінск) — 0:4, «Зорка-БДУ» (Мінск, Д 3) — «Граніт» (Мікашэвічы) — 1:4, «Ліда» (Д 2) — «Нёман» (Гродна) — 1:1 (па пенальці 1:3).

## На трэніроўку на... верталёце

Нападаючы зборнай Бразіліі Рабіньё дабіраўся на трэніроўку нацыянальнай зборнай на верталёце, бо інакш спазніўся б. Футбалісты зараз рыхтуюцца да адборачнага турніру ЧС-2010. Дарэчы, гульцу дазволілі прыбыць на базу на дзень пазней, каб падпісаць кантракт з англійскім «Манчэстар Сіці», куды форвард перайшоў з іспанскага «Рэала» (Мадрыд).

## Трэнеры выйдуць на корт

Трэнеры тэнісістак нарэшце набылі права выходзіць на корт у час матчаў, каб даваць парады сваім падапечным. Новае правіла ўступіць у сілу з 1 студзеня 2009 года. Галоўнай прычынай новаўвядзення стала жаданне гледачоў больш даведацца аб тэнісе. Для размовы з тэнісісткамі настаўнікі павінны будуць прычапіць да сябе мікрафон, каб тэлеаўдыторыя чула гутарку. Трэнеры змогуць падыходзіць да сваіх гульцоў адзін раз на працягу сэта, а таксама, калі сапернік бярэ медыцынскую паўзу. Нагадаем, што сёлета ў ліпені была дыскваліфікаваная ўкраінка Настасся Корж за падказкі, якія яна атрымлівала ад свайго бацькі-трэнера па радыёсувязі пры дапамозе мініяцюрнага навушніка.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.25 | 19.50 | 13.25 |
| Віцебск — | 6.13 | 19.42 | 13.29 |
| Магілёў — | 6.15 | 19.40 | 13.25 |
| Гомель — | 6.14 | 19.35 | 13.21 |
| Гродна — | 6.41 | 20.04 | 13.23 |
| Брэст — | 6.44 | 20.03 | 13.19 |

**Месяц**

***Першая квадра.***
***Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Імяніны**

**Пр.** *Калініка, Мікалая, Паўла, Яфрэма.*
**К.** *Дароты, Юстыны, Ваўжынца, Лаўрэна, Станіслава, Тодара.*




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +26..+28°С | КІЕЎ +30..+32°С | РЫГА +20..+22°С |
| ВІЛЬНЮС +27..+29°С | МАСКВА +22..+24°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°С |

Дзве даты

## 5 верасня



**1930 год** — заснаваны Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь (як Беларускі дзяржаўны ансамбль народных інструментаў пад кіраўніцтвам І.І. Жыновіча, з 1974 года носіць імя свайго заснавальніка).

**1905 год** — Расія і Японія падпісалі ў Портсмуце (ЗША) мірны дагавор, які завяршыў руска-японскую вайну 1904—1905 гадоў.

Цытата дня:

*«Імя мае толькі той, хто адкідвае свае тытулы і званні, таму што яны меншыя за імя».*

**Зігмунд Граф (1898—1979), нямецкі пісьменнік.**

Усміхнёмся!

**Тэрмінова патрабуецца дапамога! Зламаўся будзільнік. Тэлефанаваць штодня, акрамя выхадных, у 8.00.**

☺

— Ну і як табе водпуск, атрымалася добра адпачыць?

— Ды ведаеш, ніякай асаблівай розніцы ў параўнанні з офісам: вакол суцэльны натоўп прыдуркаў, якія лапочуць ні аб чым, цягаюцца з месца на месца, нічога не робяць і толькі чакаюць абеду.

☺

**Муж прыходзіць з работы позна, на стале запіска:**

**«Пельмені ў маразілцы, суп на пліце. Генадзя ў шафе не будзі, яму ў ноч».**

☺

Пісьменнік прыйшоў на творчы вечар разам з маладой жонкай. Знаёмы:

— Сукенка і біжутэрыя ў тваёй жонкі — гэта проста паэма!

— Не, сябар мой, — гэта пяць паэм і дзве навелы.

☺

**Печань з трывогай чакала пятніцы, Ныркі таксама хваляваліся, што давядзецца шмат працаваць, Глотка разміналася, Нос чухаўся, Страўнік рыхтаваўся, Ягадзіцы хваляваліся, што зноў на іх знойдуць прыгоды, Ногі з Языком рыхтаваліся заплятацца, Галава баялася захварэць, Сэрца крывёй абліvалася. І толькі адзін Мозг цешыўся тым, што пятніца не за гарамі.**



# СЕРАБРО

свет і сусвет чалавека

**Серабро** — каштоўны метал белага колеру, які ў большасці тлумачэнняў народнай культуры звязваецца з Месяцам, азначае дзявоцкасць, цнатлівасць, жаночы пачатак.

Серабро стала другім пасля золата сімвалам дабрабыту. З яго, як і з золата, выраблялі ўпрыгажэнні і рытуальныя рэчы, прызначаныя для ахвяраванняў — чашы, падсвечнікі, апраўы абразоў і г.д. І сёння існуе традыцыя прыносіць у храм і вешаць каля абразоў Божай Маці, якая даравала пазбаўленне ад хваробаў, вырабы з серабра ў выглядзе сэрца, нагі, рукі і г.д.

- У народных павер'ях серабро было надзелена вялікай моцай у барацьбе з нячыстай сілай: сярэбраная куля забівала ваўкалакаў і ведзьмакоў.
- Лічылася, што прысутнасць у хаце сярэбраных рэчаў захоўвае яе ад удараў маланкі.
- Здавён у народзе ведалі пра дэзынфекцыйныя якасці серабра. Часам сярэбраныя манеты клалі ў жбаны з вадой для пітва і г.д.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# САМАЯ АБАЯЛЬНАЯ і прыцягальная... аўтамабілістка

Прыгожае жыццё

*У Мінску выбралі «АўтаЛэдзі-2008»*

Акцыя «АўтаЛэдзі», якую ўжо ў шосты раз праводзіла радыёстанцыя «Альфа Радыё», сёлета выклікала ў прыгожага полу небывалую цікавасць. Больш як 300 аўтааматарак узялі ўдзел у бясплатнай фотасесіі на фоне аўтамабіляў «Mazda», прычым пачэснымі гасцямі акцыі сталі многія «зоркі»: спявачкі Вольга Плотнікава, Гюнеш, Вера Карэтнікава, Алена Грышанава, Ганна Шаркунова, тэлевядучая Люся Лушчык, гітарыстка Ірына Ігнацюк, «свецкая львіца» Элеанора Язерская... Па выніках інтэрнэт-галасавання балельшчыкаў у фінал прайшлі 13 дзяўчат, яшчэ чатыром далі шанц арганізатары. Перш чым разгарэлася барацьба за перамогу, усе фіналісткі атрымалі магчымасць правесці тэст-драйв аўто — кіраўнік Школы экстрэмальнага ваджэння Сяргей Аўчыннікаў ацэньваў узровень майстэрства, выпраўляў памылкі і даваў каштоўныя парады кожнай удзельніцы. І толькі потым дзяўчат чакалі конкурсныя выпрабаванні, «крычалкі» груп падтрымкі і ваганні журы, каму ўсё ж прысудзіць перамогу. У выніку тытул «АўтаЛэдзі» заваявала актрыса тэатра і кіно Таццяна Каліх, другое месца падзялілі студэнткі-прыгажуні Кацярына Цыганок і Ганна Вакульчык, і адразу тры дзяўчыны — Наталля Масленнікава, Марына Стружко і Ганна Гомза — атрымалі прыз сімпатый, глядацкіх і журы. І, натуральна, усім дасталіся тэматычныя аўтамабільныя прызы.

**Ліна МАЛІНІНА.**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 4870. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12